Пролетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА САВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ І ЎПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР

№ 19 (433) | Панядзелак, 1 мая 1939 года | Цана 20 кап.

НЯХАЙ ЖЫВЕ 1-е МАЯ



1 мая 1939 года

Знікла з карты Еўропы Аўстрыя...

Разарвана на кавалкі і растаптана фашысцкім ботам дэмакратычная Чэха-Славакія...

Затоплена ў крыві мужная рэспубліка народнага фронта — Іспанія...

Крывёю абліваецца гераічны кітайскі народ, адбіваючыся ад сляпнямі насядаючых з усіх бакоў японскіх драпежнікаў.

Над светам злавесна разгараецца полымя другой імперыялістычнай вайны.

Голад. Галеча. 10—16-гадзінны рабочы дзень. Больш 20 мільёнаў беспрацоўных. Шалёнае наступленне капітала на рабочы клас, на працоўных.

У такой абстаноўцы праводзяць працоўныя капіталістычных краін 1 мая 1939 года — 50-годдзе інтэрнацыянальнай вясенняй пераклічкі атрадаў рабочага класа на франтах класавай барацьбы.

Капіталізм пераходзіць у рашучае наступленне, — такі вывад зробяць яны на сёлетняй пераклічцы. Авангард рабочага класа — Комуністычны Інтэрнацыянал, які адзіна правільна кіруе рэвалюцыйнай барацьбой пралетарыята, яшчэ раз выступіць са сваімі лозунгамі, пакажа масам шлях да аб'яднанага адпору сілам капіталізма і рэакцыі.

Рабочы клас, працоўнае сялянства, перадавая інтэлігенцыя буржуазных краін ужо ўсведамляюць, што падзенне Іспанскай дэмакратычнай рэспублікі не з'яўляецца яе паражэннем. Фашызм атрымаў часовую перамогу, але не ў выніку слабасці рабочага класа Іспаніі, а таму, што ён быў здраджан. Перамога гэта не будзе доўгавечнай. Урокі гераічнай барацьбы іспанскага народа супроць здраднікаў сваёй радзімы—іспанскіх мяцежнікаў і іх кіраўнікоў і гаспадароў з італа-германа-японскага фашысцкага блока не пройдуць бясследна для міжнароднага рэвалюцыйнага руху. Кроў загінуўшых у барацьбе за свабоду і шчасце працоўнага чалавецтва — суровы мсцівец. Яна рэвалюцыянізіруе масы, робіць больш чырвонымі сцягі вызваленчай барацьбы.

Вось чаму ў Англіі, Францыі, у Злучаных Штатах Амерыкі і іншых старых дэмакратычных краінах капіталізма, якія паступова зжываюць сваю дэмакратыю, расчышчаючы дарогу рэакцыі, народныя масы ўсё больш усведамляюць неабходнасць кансалідацыі ўсіх сваіх сіл для адпору фашызму і фашысцкай агрэсіі.

Комуністычныя партыі гэтых краін растлумачваюць масам, што толькі ў выніку слабасці сіл народнага фронта ў іх уласных краінах, у выніку недастатковага ціску народных мас Англіі, Францыі і Злучаных Штатаў Амерыкі на свае буржуазныя ўрады фашызму ўдалося часова задушыць рэспубліканскую Іспанію. І цяпер нават стаяўшым у баку ад рэвалюцыйнай барацьбы пролетарыята сярэднім пластам насельніцтва дэмакратычных краін становіцца ясна, што палітыка згавору з фашысцкім агрэсарам, палітыка «міратворчых» уступак фашызму, якую праводзяць іх урады, не мае нічога агульнага з сапраўднай палітыкай міру. Наадварот, такая палітыка іх урадаў у цяперашні момант толькі ўмацоўвае сілы фашызма, а фашызм, як вядома ўжо кожнаму, — гэта вайна. Хто не хоча вайны, хто не хоча, каб фашысты разбуралі культуру і цывілізацыю чалавецтва, — той павінен станавіцца ў рады актыўных барацьбітоў за мір. Іншага шляху няма: нейтральным быць нельга.

За мір, за дэмакратычныя свабоды, за социялізм!—пад такім лозунгам выйдуць працоўныя капіталістычных краін на першамайскія маніфестацыі. І лозунг гэты прыцягне новыя мільёны працоўных пад сцягі Комуністычнага Інтэрнацыянала.

Адна толькі краіна ў свеце штогод сустракае 1 мая як радаснае свята ўсё расцвітаючай вясны чалавецтва,—Савецкі Саюз. Наша горача любімая радзіма з кожным годам становіцца яшчэ больш сталай, мужнай і велічнай. Яе народ—герой! Яе народ — перадавы змагар за комунізм! Пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна ён пабудаваў социялізм і цяпер прагна ўглядаецца ў абрысы будуемага комуністычнага грамадства. Генеральны план яго пабудовы распрацаваў вялікім зодчым XX стагоддзя—Іосіфам Вісарыёнавічам Сталіным і зацверджан XVIII з'ездам партыі большэвікоў. Які прастор для мозгу і рук, для смелага дзярзання і творчасці! Вось яна, свабода кожнага жыць і тварыць!

Гэтага няма ні ў адной іншай краіне.

І таму першамайскія маніфестацыі працоўных СССР—радасныя, бадзёрыя—пройдуць пад лозунгам братняй салідарнасці з рабочым класам, працоўным сялянствам і прагрэсіўнай інтэлігенцыяй зарубежных краін, змагаючыміся за сваё хутчэйшае вызваленне ад іга капіталізма і фашызма. Пройдуць пад лозунгам аховы социялістычнай радзімы ад замахаў ворагаў чалавецтва—фашыстаў і іх шматлікіх наймітаў. Пройдуць пад лозунгам:

«Няхай жыве вялікі, непераможны сцяг Маркса — Энгельса — Леніна—Сталіна! Няхай жыве ленінізм!»

МАСКВА, КРЭМЛЬ

Таварышу Сталіну

ДАРАГІ ІОСІФ ВІСАРЫЁНАВІЧ!

Калі над краінай твой голас прарочы
Узняўся з сусветнай трыбуны — Крэмля
Панiклі пачвары і прывіды ночы,
І слухала, дух затаіўшы, зямля;

І сэрцам гарачым былі мы з табою
І крочылі ў мыслях за мудрым услед,
З вышынь недасяжных, што ўзялі мы з боем
Тваімі вачыма глядзелі на свет.

І думка ляцела над светам, як сокал,
За межы радзімы. Там з краю ды ў край
Мы бачылі цемры шаленства навокал,
Мы бачылі гора людскога адчай.

Мы бачылі — кроўю залітыя прасторы,
Дзе свастыкі чорныя цені ляглі,
Мы бачылі трупаў знявечаных горы, —
Шакалы фашысцкія іх сцераглі.

Імглістыя хмары над светам навіслі,
Удушлівым дымам прасякнута цьма.
Няма там прыпынку для творчае мыслі,
Разумнаму слову прытулку няма.

Забойцы, патомкі майстроў інквізіцый,
Там зноў аднаўляюць малюнак стары.
Пагромшчык гуляе па плошчах сталіц іх,
Кат геніяў творы нясе на кастры.

Глядзіць на нас Захад, як восень уночы,
Ды чорныя цені снуе па зямлі.
Там ходзіць трывога, там стогне рабочы
Куюць там кайданы вайны кавалі.

Крывавыя цені, як слугі пякельныя,
Выходзяць з фашысцкіх пячэрын і нор.
Раззявіўшы прагна звярыныя пасці,
Разбойнікі ладзяць зладзейскі згавор.

Крывавай расою акроплены пожні
Іспанскіх узгор'яў, кітайскіх далін,
У заўтрашнім дні там не ўпэўнены кожны
І дзень гэты ўсходзіць з-за чорных руін.

Ты нам растлумачыў законы галечы,
Дзікунства і гвалту. Мы шлем ім праклён
І славім адзіны закон чалавечы —
Леніна—Сталіна мудры закон.

***

Акінуўшы вокам шляхі і дарогі,
Што кованай сталлю за намі ляглі,
Мы бачым прасторы, мы бачым разлогі
Магутнай, дзівоснай Савецкай зямлі.

Над ёю шатрамі бяскрайняе шыры
Ірдзяцца яснoты вясёлкавых ззён,
Дзе творчая воля, пасланніца міру,
Еднае дзесяткі і сотні плямён;

Дзе сіла народаў адзіным патокам
Імклівіць няспынна да мэты адной —
Разумнай, праўдзівай, як сонца высокай, —
Да брацтва народаў крыніцы жывой;

Дзе ў роўнай ступені рабочы, вучоны,
Паэт і калгаснік, мастак і актор
Атулен увагай, ахован законам,
Дзе творчым парывам расчынен прастор;

Бязмежныя шыры, бяскрайнія далі,
І творчае працы яснoты-шляхі
Адкрыў перад намі ты, мудры наш Сталін,
Наш бацька, настаўнік і друг дарагі!

***

Маўчала ў зняменні загнанае слова
Пад панскім прыгонам, пад царскім ярмом,
Ляжала над краем маўклівасць сурова,
Адна толькі скарга хадзіла цішком.

Маўчалі паэты ў маўчанні зацятым
І марна гібелі ў глушы мастакі,
Ды сумныя песні снаваліся ў хатах
Пра гора людское праз годы, вякі.

Над любай калыскай схілялася маці
З трывогай у сэрцы і пела ўначы,
Як злую нядолю рыхтуюць дзіцяці
Цары-крывасмокі, паны-кручкачы.

Але не ўмірала надзея народа,
І вера не гасла ў цудоўныя дні,
І тлелі вякамі праз цяжкія годы
Народныя сілы і праўды агні.

Прыйшла яна, праўда, у громах змагання,
На крыллях агністых кастрычніцкіх бур.
І радасны золак, прадвеснік світання,
Разліў па зямлі беларускай пурпур.

І канула ў вечнасць былое закляцце,
Апалі аковы нявoлі з бядой,
І ты, правадыр, у сям'ю яго брацкую
Заклікаў народ наш усёй грамадой.

У часы-ж навалы, у грознай прыгодзе,
Як родны наш бацька, ты нас ратаваў
І добрую памяць аб нашым народзе
Дагэтуль у сэрцы сваім захаваў.

З увагай штодзённай і з клопатам дбалым
Не зводзіш з нас вока і росціш народ.
Узняў ты высока наш край занядбалы
І нашаму слову даў творчы палёт.

Бязмежныя шыры, бяскрайнія далі
І творчае працы яснoты-шляхі
Адкрыў перад намі ты, родны наш Сталін,
Наш бацька, настаўнік і друг дарагі!

Ты нам паказаў сваім словам прарочым
Дарогу да шчасця, дарогу ў вякі.
Па гэтай дарозе з народам мы крочым —
Паэты, артысты, пяўцы, мастакі.

***

Мы службы не знаем больш слаўнай, пачэснай
Як зліцца з народам у працы сумеснай
І зорнай дарогай тваёй, правадыр,
Нясці ўсяму свету і волю і мір.

Пра нас ты сказаў — і сардэчнае слова
Натхняе да працы вялікай і новай.
Мы вернымі будзем народу свайму,
І сілы, і веды, і песні — яму!

Магутнасць Антэя — у дружбе з зямлёй
А наша — ў еднанні з народнай сям'ёй
Крыштальны твой шлях, як крыніца ў лугах,
Народа настаўнік, народа слуга!

Няхай наша творчасць, заўсёды жывая,
І сэрцы і думы людзей акрывае,
Хай кожная песня і кісці узмах
Нам радасць прыносіць, а ворагам — страх.

Уславім зямлі раскаванае ўсходы,
Уславім арлоў — гадаванцаў народа,
У песнях, што нашыя сэрцы складуць,
Хай вечна героі народа жывуць!

Бацькі, што ў баях баранілі краіну,
Шчасліва ўсміхаюцца роднаму сыну —
Ён гучную скрыпку трымае ў руках,
Іграе пра вольна-адчынены шлях.

Ён першы між першых на конкурсах свету,
На гонар, на славу краіны Саветаў.
Пад сталінскім сонцам, ласкавым заўжды
Расце нашых талентаў сад малады.

Ці восенню ціхай, ці раннім прадвеснем,
Звініць у прасторах свабодная песня.
Найлепшая мара прыносіць нам плод.
Шчасліва жыве беларускі народ.

Збіраемся мы на вяселлі, на святы,
І чуецца песня: «Жывіце багата!».
Мы словам паэта і песняй сваёй
Радзімы любімай пільнуем спакой.

У скарбніцу перлы прыносілі людзі,
Яе вартавымі надзейнымі будзем.
Заззяюць ярчэй над савецкай зямлёй —
Чайкоўскі і Пушкін, Рэмбрандт і Талстой.

Як дар залаты, мы нясем тыя творы
У гушчы народа, у нашы прасторы.
Хай геніяў голас натхнёны гучыць,
Людзей навучае змагацца і жыць.

Мы партыі нашай магутную зброю —
Навуку марксізма глыбока засвоім.
І вольнаму люду, як ззянне зары,
Яе панясуць мастакі, песняры.

Мы помнім гісторыі ясны наказ.
Ключы чалавечага шчасця у нас.
Каб свет комунізма хутчэй збудавалі,
Будзем як Ленін,
Будзем як Сталін!

***

Шчаслівыя мы сваёй роляй пачэснай,
Што вызначыў ты мастаку, песняру.
Мы першыя ў свеце з натхнёнаю песняй
Выходзім спаткаць комунізма зару.

Сагрэў ты, як сонца, лясы і дубровы
Бацькоўскаю ласкай, наш друг дарагі.
Праходзіць прасторамі гоман вясновы,
Красуюць узгоркі, палі і лугі.

І з песняй дзяўчына ідзе да крыніцы,
І з песняю хлопец свой трактар вядзе,
Пад песню праходзяць палкі ля граніцы,
Пад песню эскадра плыве па вадзе.

У слова мы ўклалі любоў да радзімы —
Яна нашым вобразам сілу дала,
Любоў да цябе, правадыр наш любімы,
Палёт нашых думак у высь падняла.

Мы цемры спрадвечнай праклящце скрышалі,
Мы творым на славу савецкай зямлі—
Мы слова твайго залатыя скрыжалі
Над светам як сцягі мастацтва ўзнялі.

Жыццё чалавека зрабіў ты прыгожым,
Каб зоркаю кожны свяціў між людзей,
Мы справамі славім твой велічны розум,
Мы імем тваім называем дзяцей.

Бо сталінскім сонцам развеяны змрокі,
Шырокія ўсюды шляхі пралеглі,
Ідуць нашы дзеці упэўненым крокам
Па нашай, па сонцам залітай, зямлі.

Зямля, што агнём прамяністым сагрэта,
Што цёпла дыміцца вясной з-пад плугоў,
Пад сцены крэмлёўскія ў жніўнае лета
Нясе табе ў хвалях жытнёвых любоў.

Народнай любві залатыя зярняты
Збіраем мы ў лепшыя песні свае,
Мы з імі выходзім на людныя святы —
Народ іх пад сцягам чырвоным пяе.

Наказы твае паўстаюць перад намі,
І мы абяцаем, наш бацька, табе.
Што вернымі будзем Радзімы сынамі
У працы сваёй, у сваёй барацьбе.

У сталінскай дружбе красуюць народы,
З'еднала іх дружбаю большэвікі,
Для нас яна роднаю будзе заўсёды,
Мы горда яе пранясем у вякі.

Мы чуем: вайны набліжаюцца буры,
Мы, сіл не шкадуючы, будзем штогод
Народ уздымаць да вышыняў культуры
І словам мастацкім узбройваць народ.

Клянемся табе, правадыр і настаўнік,
Як толькі вайна загрыміць над зямлёй,
Са зброяй і песняй суровай мы станем
На абарону Радзімы сваёй.

У бойцы смяротнай праклятым фашыстам
Прысуд мы напішам магутнай рукой.
Пад Леніна — Сталіна сцягам агністым
Жыць будуць народы адзінай сям'ёй!

Няхай-жа красуе краіна Саветаў
Працоўным на радасць, фашыстам на страх,
Хай вечна гарыць, палымнее над светам
Сцяг працы, наш ленінска-сталінскі сцяг!

Красуйся-ж і ты, правадыр наш любімы,
Як сонца з вышынь, асвятляй нам шляхі,
Наперад вядзі нас для шчасця радзімы,
Мы сэрцам з табой, правадыр дарагі!

Пісьмо склалі:

Якуб КОЛАС, К. КРАПІВА, А. КУЛЯШОЎ, Э. АГНЯЦВЕТ, М. КЛІМКОВІЧ.

Прынята на агульным сходзе работнікаў літаратуры і мастацтваў гор. Менска.

ПРАЦАВАЦЬ ТАК, ЯК ВУЧЫЦЬ ПАРТЫЯ ЛЕНІНА—СТАЛІНА

СХОД РАБОТНІКАЎ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ гор. МЕНСКА

25 красавіка ў памяшканні Дзяржаўнага Яўрэйскага тэатра адбыўся сход работнікаў літаратуры і мастацтваў гор. Менска, прысвечаны вынікам XVIII з'езда ВКП(б). Сход гэты ператварыўся ў дэманстрацыю любві і адданасці мастацкай інтэлігенцыі сваёй комуністычнай партыі і вялікаму правадыру народаў Іосіфу Вісарыёнавічу Сталіну.

Сход адкрыў сакратар гаркома КП(б)Б тав. Бяляеў. Пад бурныя апладысменты выбіраецца ганаровы прэзідыум схода ў складзе членаў Палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з таварышам Сталіным, тт. Тэльмана, Хозе Дыяса і Далорэс Ібаруры. Засл. арт. рэсп. І. А. Мурамцаў уносіць прапанову выбраць ганаровым старшынёй схода таварыша Сталіна. Зала сустракае гэту прапанову бурнай авацыяй і стоячы вітае таго, хто вядзе народы СССР ад перамогі да перамогі.

З дакладам аб рабоце XVIII з'езда ВКП(б) выступіў пісьменнік-ордэнаносец М. Ц. Лынькоў.

— Мы, работнікі мастацтваў, — сказаў у сваім выступленні тав. Бяссмертны, — завяраем сталінскі Цэнтральны Камітэт ВКП(б), вялікага правадыра таварыша Сталіна, што ўсе работнікі мастацтваў, узброеныя большэвіцкімі рашэннямі XVIII з'езда партыі, будуць з нястомнай энергіяй змагацца за няўхільнае выкананне гэтых рашэнняў.

— Гісторыя ВКП(б) і XVIII з'езд партыі Леніна — Сталіна захапляюць, натхняюць і навучаюць змагацца і будаваць, змагацца і тварыць, змагацца і перамагаць, — гаварыў тав. З. Бядуля. Ён указвае, што да гэтага часу ў беларускай літаратуры адсутнічае гарадская тэматыка, мала паказана жыццё рабочых і гарадской інтэлігенцыі, мала паказана Чырвоная Армія.

Тав. Шчэглоў заклікае вучыцца ў таварыша Сталіна стылю работы, глыбокаму падыходу да вырашэння складанейшых праблем, уменню ясна і проста растлумачваць шырокім масам самыя складаныя, глыбока-філасофскія пытанні.

— Ніколі яшчэ, — кажа тав. Азгур,— савецкая інтэлігенцыя не адчувала так сваю кроўную сувязь з партыяй Леніна—Сталіна, як у дні XVIII з'езда і зараз. Савецкія мастакі імкнуцца ствараць такія вобразы, якія натхнялі-б масы ў іх гіганцкай рабоце, выхоўвалі народ у духу комунізма, якія дапамагалі-б будаваць комуністычнае грамадства.

Тав. Орлоў гаворыць аб смеласці, вынаходніцтве, дзярзанні, якія павінны характарызаваць наша тэатральнае мастацтва.

Пад доўгія і бурныя авацыі сход прыняў прывітальнае пісьмо таварышу Сталіну, напісанае ў вершах.

СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА САМАДЗЕЙНЫХ КАЛЕКТЫВАЎ

Калектывы мастацкай самадзейнасці БССР дзейсна рыхтуюцца да выступлення на Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы і дэкады беларускага мастацтва ў Маскве. У канцэртах на Ўсесаюзнай выстаўцы выступяць 200 удзельнікаў мастацкай самадзейнасці БССР. У Маскву паедуць лепшыя калектывы і выканаўцы, вылучаныя на папярэдніх праглядах у Менску і абласцях.

На права ўдзелу ў канцэртах на Ўсесаюзнай выстаўцы сярод калектываў мастацкай самадзейнасці разгортваецца соцыялістычнае спаборніцтва. Самадзейныя гурткі бяруць на сябе канкрэтныя абавязацельствы. Калектыў самадзейнасці Асінторфа выклікаў на спаборніцтва калектыў самадзейнасці БелДРЭС і ўзяў на сябе абавязацельствы: павялічыць заводскі хор да 80 чал., стварыць харавыя гурткі ў рабочых пасёлках №№ 5 і 6, арганізаваць гурткі беларускіх танцаў, струнны гурток, выступаць не радзей аднаго разу ў месяц, раз у месяц выязджаць на ўчасткі, у парадку абмену вопытам рэгулярна выязджаць на станцыю Асінаўка, на БелДРЭС, абмяняцца вопытам работы з Аршанскім самадзейным калектывам саюза медсанпрацы, арганізаваць тры выезды ў раён для абслугоўвання калгаснікаў, якія заключылі дагаворы з Асінторфам на работу, і г. д.

Драмгурток клуба работнікаў промкааперацыі гор. Шклова абавязаўся да 1 мая павялічыць склад гуртка з 11 да 20 чал. за лік лепшых рабочых і членаў іх сямей, азнаёміцца з асноўнымі элементамі акторскага майстэрства, пасля 5 рэпетыцый ведаць напамяць тэксты роляй. Кожны ўдзельнік гуртка абавязаўся здаць нормы на адзін абаронны значок. На спаборніцтва выклікан тэатральны калектыў промкааперацыі гор. Асіповічы.

Ансамбль песні і пляскі гэтага-ж клуба для павышэння палітычнага ўзроўню ўдзельнікаў ансамбля вырашыў прыступіць да вывучэння матэрыялаў XVIII з'езда ВКП(б) і гісторыі партыі, арганізаваць вучобу па нотнай грамаце і пастаноўцы голасу, правесці некалькі лекцый па гісторыі музыкі, павялічыць хор з 28 да 40 чал., вылучыць групу салістаў у колькасці 5 чал., здаць нормы на значкі ППХА і ГСА. На спаборніцтва выклікан ансамбль песні і пляскі гор. Асіповічы.

Гэтыя абавязацельствы даюць уяўленне аб шляху, па якім ідуць калектывы самадзейнасці для заваявання права ўдзелу ў канцэртах на Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы. І той факт, што ўся работа праводзіцца метадам соцыялістычнага спаборніцтва, дае гарантыю поспеху.

П.

Спаборніцтва на лепшую пастаноўку абароннай п'есы

Дом народнай творчасці БССР абвясціў конкурс-спаборніцтва тэатральных гурткоў на лепшую пастаноўку п'ес абароннай тэматыкі. Задача конкурса — унядрыць у мастацкую самадзейнасць лепшыя абаронныя п'есы і палепшыць работу тэатральных гурткоў.

У спаборніцтва ўключыўся рад калектываў. Лельчыцкі раённы дом соцкультуры рыхтуе на конкурс п'есу «Партызаны» К. Крапівы, петрыкаўскі і глускі — «Падзь Сярэбраную» Пагодзіна, тэатральны гурток работнікаў міліцыі гор. Мозыра — «Маю маць» Наўрозава, гурток леспрамгаса Хойніцкага раёна — «Вочную стаўку» бр. Тур і Шэйніна і г. д.

Акрамя гэтых п'ес, у рэкамендацыйным спісу пералічаны яшчэ п'есы «Мяцеж» Фурманава, «Шторм» і «Пагранічнікі» Біль-Белацэркоўскага, «Першая Конная» Вішнеўскага, «Разлом» Лаўрэнёва, «Разгром» Фадзеева, «Слава» Гусева і «Любоў Яравая» Трэнёва.

Конкурс - спаборніцтва закончыцца паказам лепшых тэатральных гурткоў у Менску 1 жніўня 1939 года — у Міжнародны антываенны дзень. Лепшыя тэатральныя калектывы, іх кіраўнікі, лепшыя выканаўцы, афарміцелі, загадчыкі клубамі, хатамі-чытальнямі, старшыні калгасаў і сельсаветаў, якія стварылі добрыя ўмовы для работы гурткоў, будуць прэміраваны.

У дапамогу гурткам самадзейнасці Дом народнай творчасці арганізаваў кансультацыю і камандыруе на месцы сваіх метадыстаў.

Абмен вопытам мастацкай самадзейнасці

Калектывы мастацкай самадзейнасці гомельскага чыгуначнага клуба імя Леніна запрасілі да сябе на першамайскія святы хор і танцавальны гурток калгаса «III Інтэрнацыянал». Лапіцкага сельсовета Асіповіцкага раёна для абмену вопытам работы. Калгаснікі прынялі запрашэнне і раніцой 2 мая выязджаюць у Гомель. Увечары таго-ж дня ў клубе імя Леніна адбудзецца таварыская сустрэча. Калгаснікі пакажуць чыгуначнікам старажытныя беларускія народныя танцы—«Талака», «Мікіта», «Шостак», а калектыў самадзейнасці клуба імені Леніна прадэманструе свае дасягненні. Пасля гэтага мастацкі кіраўнік тэатральнага калектыва клуба тав. Аграпянц правядзе з калгаснікамі гутарку аб метадах работы гурткоў самадзейнасці.

Цікавае і карыснае пачынанне гомельскіх чыгуначнікаў заслугоўвае пераймання.



Павільён СССР на Міжнароднай выстаўцы ў Нью-Ёрку. «І. В. СТАЛІН і А. М. ГОРКІ» — карціна А. Герасімава.

Фотахроніка ТАСС.

АБ ВЫНІКАХ XVIII З'ЕЗДА ВКП(б) ЗАДАЧАХ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ

З даклада тав. М. ЛЫНЬКОВА на сходзе работнікаў літаратуры і мастацтваў гор. Менска

Таварышы!

Больш месяца таму назад закончыў сваю работу XVIII гістарычны з'езд партыі большэвікоў, з'езд партыі пераможцаў з'езд партыі, высока трымаючай сцяг канчатковага вызвалення ўсяго чалавецтва ад ланцугоў капіталізма, сцяг новага чалавечага грамадства, грамадства комуністычнага, сцяг Леніна—Сталіна.

З велізарнай любоўю, з бязмежным давер'ем, з глыбокай верай у правату нашай справы ўслухоўвалася прапоўнае чалавецтва ў словы, якія гаварыліся з крэмлёўскай трыбуны, з трыбуны з'езда. У гэтых словах працоўныя бачаць велічную, сонечную дарогу да шчаслівага, радаснага і свабоднага жыцця, па якой ідуць совецкія народы пад сцягам баявой комуністычнай партыі: дарогу, якая вядзе да далейшых грандыёзных перамог, да нябачаных дасягненняў і поспехаў: дарогу, якая вядзе ў светлае комуністычнае заўтра.

Баец вялікага кітайскага народа, палкі рэволюцыянер гераічнай Іспаніі, пакутуючы ад фашызма нямецкі і італьянскі рабочы, свабодалюбівы працаўнік-чэх, горды партызан-абісінец, — кожны з іх з глыбокім сардэчным трапятаннем прыслухоўваўся да крэмлёўскага слова і скрозь злавесныя, крывавыя туманы, якія навіслі над іх радзімай, бачыў і бачыць праменістыя крэмлёўскія зоры, сімвал сваёй будучай перамогі, сімвал немінучага разгрому чорных сіл рэакцыі, атрутных фашысцкіх фаланг, фашысцкай агентуры — здраднікаў і рэнегатаў, пацыфістаў, баялдунаў усіх масцей і колераў.

І ўсюды па неабсяжных прасторах зямлі — у Еўропе, Амерыцы, Азіі, усюды, дзе б'ецца чэснае, гарачае, свабодалюбівае сэрца працоўнага прыгнечанага чалавека, усюды, па ўсяму зямному шару пралятае хвалюючае, гордае слова, якое ўзнімае на барацьбу, кліча ў бой, да перамог.

Гэта гордае слова ляціць па гарадах і вёсках, беспрашкодна пералятае граніцы, пранікае праз краты фашысцкіх засценкаў, праз калючы дрот канцэнтрацыйных лагераў. Прад ім бяссільны паліцэйскія кардоны, «антыкомінтэрнаўскія пакты», усе рагаткі з словаблуддзя прадажнай буржуазнай дэмакратыі, усе хітраванні чалавеканянавісніцкага свету.

Гэта слова — Сталін!

Гэта слова — Іосіф Вісарыёнавіч!

З якой радасцю, з якім натхненнем слухалі мы мудрыя словы сталінскага даклада, бязлітасна агаліўшага ўсе смяротныя язвы сучаснага капіталістычнага свету.

Цудоўнай песняй перамогшага соцыялізма прагучаў раздзел даклада таварыша Сталіна, прысвечаны соцыялістычнаму будаўніцтву, нашым перамогам, перамогам на ўсіх участках плённай творчай работы совецкага народа. Няўхільны ўздым народнай гаспадаркі, росквіт соцыялістычнай культуры ўсіх народаў Совецкага Саюза, нябачанае ў гісторыі маральна-палітычнае адзінства народа, несакрушальная магутнасць нашай дзяржавы, дзе мы бачым адзіныя мэты, адзіныя задачы, непарушную агульнасць інтарэсаў народа, партыі і дзяржавы, бязмежныя перспектывы далейшага будаўніцтва, бурны рост матэрыяльнага дабрабыту народа, сталінская дружба народаў і рэспублік — вось што ўяўляе сабою наша цудоўная радзіма.

Такая наша краіна, краіна перамогшага соцыялізма, краіна найбольш передавая ва ўсім свеце па насычанасці перадавой тэхнікай прамысловасці і сельскай гаспадаркі, краіна з прамысловасцю, якая вырасла ў дзевяць разоў у параўнанні з даваеннымі годамі, якая не ведае роўных у свеце па ўзроўню і тэмпах развіцця індустрыі, краіна з магутнай калгаснай сельскай гаспадаркай. Толькі ў нас з ростам эканамічным расце матэрыяльны і культурны дабрабыт працоўных.

Дружаственае супрацоўніцтва рабочых, сялян, соцыялістычнай інтэлігенцыі, умацаванне дружбы народаў, маральна-палітычнае адзінства народа робіць нашу дзяржаву магутнай і непераможнай. У гэтым крыніца невычарпальнай сілы і магутнасці совецкага ладу.

У пабудове комуністычнага грамадства ганаровыя і адказныя задачы ўскладаюцца на нашу соцыялістычную інтэлігенцыю.

Наша краіна ўвасабляе сабою прагрэс, наша грамадства ўвасабляе сабою самыя перадавыя ідэі. Вось чаму і людзі навукі, тэхнікі, мастацтва ў нашай краіне падняты на нябачаную ў гісторыі вышыню. Мы з'яўляемся работнікамі совецкага мастацтва: самага перадавога, самага ідэйнага мастацтва ў свеце. Мастацтва па характару свайму, па сіле ўздзеяння на чалавека, на грамадства з'яўляецца адным з магутных выхаваўчых сродкаў. Зразумела таму выключная і велізарная роля нашага мастацтва ў справе комуністычнага выхавання працоўных.

Кожны работнік мастацтва — пісьменнік, артыст, кампазітар, мастак, калі ён хоча, каб яго работа была паспяховай, большэвіцка дзейснай, каб гэта работа давала канкрэтныя, адчувальныя рэзультаты, — павінен усвядоміць сваё месца сваю ролю ў нашай дзяржаве, павінен быць перадавым чалавекам нашага грамадства.

Калі будзеш у сваёй рабоце замыкацца ў сваю ўласную скарлупіну, прыслухоўвацца толькі да свайго дыхання, да біцця толькі свайго сэрца, не адчуваючы магутнага пульсу жыцця стасямідзесяцімільённага калектыва, не адчуваючы яго радасцей, яго смутку, яго вялікіх і благародных парываў — тады не станеш перадавым чалавекам сваёй эпохі, не станеш тым дзеячом, аб якім мы гаворым як аб дзеячу сталінскага тыпу.

Каб стаць такім дзеячом, неабходна, апрача ведаў, таленту, здольнасцей, апрача жадання працаваць, мець яшчэ адну неаспрэчную якасць: быць узброеным марксісцка-ленінскай тэорыяй. Мы гаворым «узброеным» таму, што імення гэта тэорыя, веды марксізма-ленінізма з'яўляюцца сапраўднай зброяй, зброяй войстрай, зброяй пераможнай, зброяй, робячай сапраўдныя цуды ў руках нашай слаўнай комуністычнай партыі.

Марксісцка-ленінская тэорыя прыводзіць у стройны парадак нашы веды, аблагароджвае нашы таленты, арганізуе нашу волю, нашы жаданні, усю нашу работу.

Кожны наш твор, ці будзе то кніга, палатно жывапісца, музыкальныя запісы кампазітара альбо сцэнічны вобраз у тэатры, — павінен быць яркім пасьбітам ідэй комунізма, страснай прапагандай і агітацыяй за пабудову комуністычнага грамадства. У нашым мастацтве няма месца халоднай роўнадушнасці, роўнадушнаму мастаку. У нашым мастацтве няма месца спакойнаму, алімпійскаму сузіральніку, які «добру и злу внимал бы равнодушно». Большэвіцкая страсць, глыбокае творчае гарэнне, творчае дзярзанне, ініцыятыва, смеласць, мужнасць, сталінскі тэмперамент, — вось неад'емныя якасці, без якіх немысліма ў нашых умовах творчае аблічча совецкага дзеяча мастацтва. Толькі пры гэтых якасцях здолеем мы паказаць усю веліч, усю многагранкасць цудоўнейшай з эпох — эпохі Леніна—Сталіна.

Навука, літаратура, мастацтвы дасягнулі выключнага росквіту ў нашай краіне. Совецкі Саюз стаў сапраўдны радзімай усяго выдатнага і геніяльнага, стаў адзіным ахоўвальнікам культурных багаццяў, культурнай спадчыны ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва. Ленінска-сталінская нацыянальная палітыка забяспечыла росквіт нацыянальных культур усіх братніх народаў, росквіт прафесіянальнага мастацтва і народнай творчасці. Нідзе ў свеце не карыстаецца такой вялікай пашанай шчаслівая, радасная песня, як у нашай краіне. Джамбул, залаты салавей казахскіх стэпаў, спявае аб совецкай краіне як аб радзіме шчаслівай песні:

«Прыслухайцеся! Спявае краіна. Спяваюць народы. У гэты хор цякуць свабоднай хваляй, як рэкі ў мора, усе мовы!».

Каб нашы мастацтвы, якія дасягнулі такіх выдатных вышынь, развіваліся, раслі і ўмацоўваліся, як мастацтвы нараджаючагася комуністычнага грамадства, мы павінны знішчыць некаторыя рэальныя перашкоды, некаторыя недахопы нашы, якія ў асобных выпадках зніжаюць якасць нашай работы, нашых твораў.

Сапраўднае соцыялістычнае мастацтва несумяшчальна з спробамі асобных майстроў, жалкіх рамеснікаў, — я гавару майстроў-рамеснікаў, а не мастакоў, — абяскровіць у сваім творы жыццё, падвесці яго пад нейкі прычасаны, прылізаны стандарт, у якім усё багацце духоўнага жыцця нашага чалавека, яго радасці, яго смутак, яго поспехі, яго цяжкасці, складанейшы свет яго перажыванняў, пачуццяў, страсцей падмяняецца надсалоджаным штампам, стандартнымі «шырпатрэбаўскімі» вобразамі, падлакіраванымі танным славесным лакам — фігурамі. Такія, з дазволу сказаць, творы ў лепшым выпадку выклікаюць горкую прыкрасць чытача, гледача. А часам гэтыя творы, спекулірующы на войстрай злабадзённай тэме, прыцягваючы да сябе чытача, гледача, прывіваюць паганыя густы, зніжаюць мастацтва, абдзяняюць яго, заражаюць хуласоччам, закалыхваюць нашу волю да барацьбы, прытупляюць пільнасць.

Велізарную ролю ў жыцці мастацтва мае правільна пастаўленая крытычная работа. У нас недаацэньваецца роля і значэнне крытыкі. Работнікі крытыкі не карыстаюцца яшчэ дастатковай увагай і дапамогаю з боку работнікаў мастацтваў. Няма яшчэ сур'ёзнай увагі росту і выяўленню новых крытычных кадраў, добрай арганізацыі ўсёй іх работы. Адсюль мы маем такія факты, што нашы асобныя крытыкі ў сваёй рабоце выходзяць з усякіх пабочных, прыўваходзячых акалічнасцей, нічога агульнага не маючых з сапраўднымі задачамі мастацтва. «А што скажа Мар'я Аляксееўна?» — вось меркаванне, якое дыктуе часам таму ці іншаму гора-крытыку яго вывады аб асобнай з'яве мастацтва. Усе гэтыя «каб чаго не выйшла», усе гэтыя страусавыя метады і прыёмы, бесхрыбетнасць, бяспрынцыпнасць, няўменне, нежаданне адстойваць правільнае палажэнне, правільную мысль — час даўным-даўно выгнаць з практыкі крытычнай работы. Я не раблю тут абагульненняў, але такія з'явы ёсць і ў нашай рэчаіснасці.

Работнік мастацтва і крытык, які яго крытыкуе, павінны адчуваць сябе на роўных правах, членамі аднаго калектыва, калектыва баявога совецкага мастацтва. Узаемнае разуменне і павага будзе ў іх тады, калі кожны з іх усвядоміць сваю ролю ў будаўніцтве нашай культуры, нашага будуемага комуністычнага грамадства.

Мы сустракаемся яшчэ ў нашым асяроддзі з усякімі перажыткамі мінулага — нелюбоўю да самакрытыкі, хваравітай ганарлівасцю, празмерным раздзьмуваннем свайго ўласнага «я» на шкоду калектыву. Ёсць яшчэ агідныя выпадкі, калі асобны працаўнік мастацтва радуецца ў душы творчай няўдачы свайго субрата. Уласна кажучы, гэта не радасць, гэта вельмі агіднае пачуццё, пачуццё жывёльнай, заалагічнай канкурэнцыі, самы гнусны рэцыдыў старой, капіталістычнай свядомасці.

Сапраўднае творчае садружаства, сапраўднае хваляванне за поспех усяго калектыва, сяброўская ўзаемадапамога, уменне без агляжкі крытыкаваць і крытыкавацца — вось неад'емная якасць, якую мы павінны выхаваць у нашым асяроддзі.

Задача настойлівай, упартай, сістэматычнай вучобы стаіць заўсёды перад намі. Мы маем велізарную культурную спадчыну, незлічоныя багацці культуры, створаныя чалавецтвам на працягу раду стагоддзяў. Трэба ведаць гэтыя багацці, сур'ёзна і глыбока асвойваць іх, вучыцца на іх. Трэба кожны дзень, кожную мінуту ўдасканальваць сваё майстэрства, дабіваючыся большых поспехаў, большых перамог.

«Мы ранавата ўкладваемся драхнуць на таненькіх лаўрах, мы ўсё яшчэ жывём на авансы чытача, неадпрацаваныя намі. Чытач сказаў нам на з'ездзе нашым, чаго ён чакае і патрабуе ад нас, але мы нібы не верым, што ён мае права патрабаваць, і прадаўжаем забаўляцца глупствамі, дэманстрыруючы нашу малапісьменнасць, наш мешчанаваты індывідуалізм і роўнадушнасць нашу к закліку трагічна прыгожай эпохі (А. М. Горкі, «Літаратурныя забавы», 1935).

Гэтыя выдатныя словы Аляксея Максімавіча Горкага не страцілі сваёй вайстрыні і ў даны час, і многім з нас яны могуць быць яркім дакорам.

А вось выдатныя ўказанні аднаго з буйнейшых тварцоў тэатральнага мастацтва, генія рускага тэатра Канстанціна Сяргеевіча Станіслаўскага. У сваёй кнізе «Маё жыццё ў мастацтве» ён гаворыць:

«Дзевяць дзесятых работы артыста, дзевяць дзесятых справы ў тым, каб адчуць ролю духоўна, зажыць ёю: калі гэта зроблена, роля амаль гатова. Бессансоўна ўзвальваць дзевяць дзесятых работы на просты выпадак. Няхай выключныя таленты адразу адчуюць і твораць ролі. Для іх законы не пішуцца, яны самі пішуць іх. Але дзіўней за ўсё тое, што якраз ад іх мне не прыходзілася чуць, што тэхніка не патрэбна, а патрэбен толькі талент, ці наадварот, што тэхніка на першым месцы, а талент на другім. Наадварот, чым буйней артыст, тым больш ён цікавіцца тэхнікай свайго мастацтва.

«Чым больш талент, тым больш апрацоўкі і тэхнікі ён патрабуе, — сказаў мне адзін вялікі артыст. — Калі гарланяць і фальшывяць у спевах з маленькім галаском — непрыемна; але калі-б стаў фальшывіць Таманьё з сваім громападобным голасам, стане страшна».

Так разважае сапраўдны талент.

... Не існуе мастацтва, якое не патрабавала-б віртуознасці, і не існуе канчатковай меры для паўнаты гэтай віртуознасці. Выдатны французскі мастак Дэга гаварыў:

«Калі ў цябе ёсць майстэрства на сто тысяч франкаў, купі яшчэ на пяць су».

Гэтыя мыслі не губляюць для нас ні сваёй свежасці, ні актуальнасці і на сёнешні дзень. Мы, напрыклад, многаму вучымся ў геніяльнага Шэкспіра, які ўмеў паказаць чалавека ва ўсёй цэласнасці яго натуры, ва ўсёй велічы і прыгажосці яго барацьбы са злом, абаянні яго моцных пачуццяў і страсцей. Спадчына Шэкспіра — наша спадчына. У Англіі — радзіме Шэкспіра — яго для прыстойнасці паважаюць, але не ставяць яго п'ес. У фашысцкіх краінах яго ненавідзяць і забараняюць.

Гаворачы аб ролі і месцы пісьменніка ў вялікай перабудове чалавечага свету, мы не можам не ўспомніць простых і мудрых слоў паэта-рэволюцыянера, адданага патрыёта, барацьбіта за лепшую долю народа — Тараса Грыгоравіча Шаўчэнка. Ён гаварыў:

«Каб ведаць людзей, патрэбна жыць з імі. А каб пісаць пра іх, трэба самому стаць чалавекам, а не паперамаральнікам. Вось тады пішыце і тады праца ваша будзе працай чэснай».

Гэта выключна правільна.

Многае яшчэ трэба зрабіць у нас, каб па-сапраўднаму вывучыць, засвоіць тую культурную спадчыну, якую маем мы ў нас, у Беларусі. Тут многае апаганена ворагамі народа, скажона, фальсіфіцыравана. Гістарычнае мінулае нашага народа, яго культурная спадчына, яго багатая творчасць, мінулая і сучасная, усё гэта — непачаты край работы, велізарнай і патрэбнай.

Выключна велізарны нашы задачы ў сувязі з рыхтуючайся дэкадай беларускага мастацтва ў Маскве. Мабілізацыяй усіх нашых творчых здольнасцей, упартай і настойлівай работай мы павінны забяспечыць поспех нашай дэкады, вытрымаць з чэсцю экзамен на ідэйную і мастацкую спеласць нашага мастацтва.

Васемнаццаты з'езд партыі падагуліў рэзультаты нашага грандыёзнага будаўніцтва, нашага імклівага пабеданоснага руху ўперад. У гэтым руху ўперад наша партыя, наш народ бязлітасна змялі з зямлі, ператварылі ў пыл і прах усіх тых, хто спрабаваў выступіць супроць кроўных інтарэсаў народа, хто спрабаваў павярнуць назад кола гісторыі.

Ніштó і ніхто не спыніць нашага руху ўперад да ззяючых вяршынь комунізма.

Як ніколі, магутна і манаlітна наша партыя. Гэта адзінства знайшло такое яркае, такое хвалюючае пацвярджэнне ў работах з'езда, у аднадушнасці яго рашэнняў, у аднадушнасці ўсіх выступленняў з трыбуны з'езда.

Словы Іосіфа Вісарыёнавіча, словы тав. Молатава аб ролі і значэнні совецкай інтэлігенцыі нам, работнікам мастацтваў, даюць арліныя крыллі для мужных, смелых узлётаў нашай творчай мыслі. Гэтыя словы натхняюць нас на новыя подзвігі, на нябачаныя перамогі, на выдатныя творчыя дзярзанні для славы нашай радзімы, для славы нашага гераічнага народа, для славы нашай комуністычнай партыі.

І адзінае жаданне, адзіны помысел у нас: працаваць больш, працаваць лепш, працаваць паспяховей. Працаваць так, каб наша родная партыя магла сказаць:

— Так, гэта зроблена добра! Гэта зроблена па-большэвіцку! Гэта зроблена па-сталінску!

Няхай жыве наша вялікая і цудоўная радзіма — радзіма наступаючага комунізма!

Няхай жыве наша слаўная Комуністычная партыя, якая вядзе нас ад перамогі да перамогі!

Няхай жыве ў шчасці і радасці любімы настаўнік і друг наш, правадыр працоўнага чалавецтва, геніяльны кормчы Комуністычнай рэволюцыі Іосіф Вісарыёнавіч Сталін!

НАРОДНАЯ ТВОРЧАСЦЬ

ТРЫЦЦАЦЬ ПЯЦЬ ЖАНОК ІШЛО З ДАЖЫНАЧАК...

(Сказ-навіна)

Трыццаць пяць жанок ішло з
дажыначак,
З поля йшлі яны ды з калгаснага.
Поле-ж тое—ой, шырокае—
Ды пакрылася ўсё снапочкамі.
Урадзіла нам наша жыцейка —
Будзем з хлебам жыць ані дбаючы.
А ўжо сонейка ды за бор паўзе,
Яго косачкі дрыжаць, прыгаюць,
На галовачкі вянок ложыцца.
Ой, наперазу нясуць жнеечкі
Два вянкі ў руках. А вяночкі жа
З руты-зелені, з сініх кветачак,
З васілёчкаў. Букалём яны
Пераплецены, перавітыя 'шчэ й
рамонкамі.
У вяночках тых два партрэцікі:
Ў адным—Леніна, ў другім—Сталіна.
То яны далі шчасце жнеечкам,
Прагналі ад іх злу нядолечку.
Вы не журыцеся, нашы сонейкі,
Што мо' кветачкі непрыгожыя, —
Ў чыстым полечку яны выраслі,
На зямлі калгаснай нашай родненькай...
Жнейкі йдуць у калгас да старшыначкі,
І вітаюцца з ім песняй звонкаю,
Працай рупнаю шчыра радуюць:
«Ты, старшынка наш, дай віншаваць
цябе
З новым хлебушкам. Мы ўпару яго
Ў полі выжалі, не далі зярну
Далоў сыпацца. На дажыначкі
Ты пастаў-жа нам, сваім жнеечкам,
Ой, вядро віна, ды гарэлачкі».
«За работачку, за ударную
Стаўлю вам віна ды гарэлачкі,
Весяліцеся, мае жнеечкі...»
Ў канцылярыі, ой, у покуці
Два тыя вянкі яны паставілі
Сталі песні пець, піць гарэлачку,
Танцаваць кадрыль пад гармошачку.
— Ой, ты, Сталін-свет, татка
родненькі,
Ты прышоў-бы к нам на дажыначкі.

Запісаў Н. Я. ЕРМАК ад калгасніцы арцелі «Чырвоны баец» Рэчыцкага раёна ПЫРХ С. П., 35 год.

СЫНЫ

Ой, у лузе пры даліне
Два раслі дубочкі.
Прыехалі к маці ў госці
Родных два сыночкі.
Рада, рада была маці,
Седзячы ў святліцы.
Сын старэйшы матцы кажа:
Стаю на граніцы,
Сцерагу сваю краіну,
Аглядаю далі,
За адвагу і старанне
Даў мне ордэн Сталін.
Другі сын яе, малодшы,
Што быў брыгадзірам,
Ён у Арміі Чырвонай
Цяпер камандзірам.
Сыноў маці частавала
Пірагом смачненькім,
Поўны чаркі напаўняла
Віном саладзенькім.

Запісана ў Аршанскім раёне.

КАЛЫХАНКА

Маці сына палажыла,
Стала песеньку спяваць:
«Люлі-люлі, мой маленькі,
Закрый вочкі, трэба спаць.
Вырасцеш, сынок, вялікі,
Пойдзеш ў Армію служыць
Сам таварыш Варашылаў
Будзе там цябе вучыць».
Маці села над калыскай,
Стала сына калыхаць,
Надышла ужо і ночка.
«Люлі-люлі, пара спаць».

Запісана ў Бабруйскім раёне.

ДРУГАЯ МАЛАДОСЦЬ

За выдатную работу
У калгасе дзед Антон
Атрымаў узнагароду —
Галасісты патэфон.

Дзед падскочыў: «Эх, старое»,
Сеў і напісаў:
«Вельмі срочна, заказное.
Менск, у Наркамздраў.
Шліце мне амаладзіцель
Па дзесяткаў пяць:
Як юнак, я з маладзіцай
Буду танцаваць».

За выдатнейшую варту
Зноў прэміруецца дзед:
Атрымаў шмат кніжак, карту
І... веласіпед.
Дзед хутчэй кашэль пад паху.
К станцыі бяжыць.
Без затрымкі — к тэлеграфу.
Тэлеграф стучыць:

«Я чакаю, шліце, шліце...
Хочу быць я маладым,
Ў комсамол хачу ўступіць я
Разам з праўнукам сваім».

Запісалі КАШЧЭЕЎ і КРЫЖЭВІЧ ад ДЗЯТКОВА.
Салтанаўская СШ Рэчыцкага раёна.

НОВЫЯ ПРЫКАЗКІ

Для совецкага народа кругом вольная дарога.

***

За мяжой фашысты смутны, што ў нас народ магутны.

***

Няхай фашыст не марыць у нашай краіне гаспадарыць.

***

Прышоў японец к нам у «госці», дык і цяпер ныюць яго косці.

***

Хочаш заможна жыць, умей калгасам даражыць.

***

На калгасным полі цяпер ураджай, як ніколі.

***

Беражы маемасць калгасную, як сваю ўласную.

***

Раней жыла — зрэб'е насіла, а як пайшла ў калгас — адзелася ў шоўк і атлас.

З матэрыялаў секцыі этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук БССР.

З МІНУЛАГА

ЦАР МІКОЛА І ГРЫШКА РАСПУЦІН

Жыў калісьці цар Міколка,
На людзей глядзеў ён колка.
І была ў яго царыца —
Баба—ведзьма, азарніца.
Быў у іх таксама труцень,
Называўся ён Распуцін.
Жыў ён важна, як барон,
І на ім трымаўся трон.
Людзі добрыя паганца Грышку
Упісалі на той свет у кніжку
Услед за Грышкам і Міколу
Закапалі ў сырым долу.

Запісалі КАШЧЭЕЎ і КРЫЖЭВІЧ ад БАБРОЎНІКА П., 72 год. Вёска Козье, Рэчыцкага раёна.

ПРАТАКОЛ

Гэта было так.

Ехаў праз вёску ўраднік афарміць пратакол: чалавек там павесіўся. Праязджаючы праз вёску, сустрэў мужыкоў.

— Дзень добры, пан ураднік. Да каго вы прыехалі? — пытаюцца сяляне.

Ураднік адказаў, што ён едзе ў суседнюю вёску, каб афарміць пратаколам мёртвага.

— І ў нас быў павесіўся адзін, дык мы яго знялі.

А ўраднік тады як крыкне:

— Хто вам дазволіў? Усіх вас перавешаю, калі не зробіце так, як было.

Адзін хацеў сказаць, што ён, той зняты, застаўся жывы, але ўраднік раззлаваўся і гаворыць:

— Маўчаць, а то і цябе павешу зараз, — і паехаў далей.

А той, каго знялі, ужо касіў гэтым часам. Мужыкам нечага рабіць, пайшлі яны да яго ў поле і кажуць яму, што ўраднік загадаў павесіць яго зноў. Чалавек той пасля гэтага схаваўся і ніхто ў вёсцы не ведаў, дзе ён знаходзіцца.

Ураднік тым часам вярнуўся і пытаецца:

— Ну, як, павесілі?

— Павесілі, пане ўраднік, ды дужа не хацеў зноў вешацца, — пажартаваў адзін з мужыкоў.

— Як гэта не хацеў? — збялеўшы, гаворыць ураднік.

— Так, не хацеў, дык мы яго сілком прывялі з поля ды і павесілі па вашаму загаду.

— Ну, ладна, давайце афармім пратаколам.

Запісалі А. Г. КАШЧЭЕЎ і І. І. КРЫЖЭВІЧ ад І. І. ЧЭРНЕНКОВА (радыст Салтанаўскага спіртазавода).

Юр. РУДЗЬКО

СЯБРЫ

НАВЕЛА

На зямлі — вясновая ноч. Чорная, ціхая ноч. Вокам яе не пранізаш. Застаецца — слых. І чалавек слухаў. Камені, куст і чалавек—гэта пагранічны сакрэт.

Не ўпершыню ў сакрэце Пётр Астахаў. Знаёма яму, як далонь уласнай рукі, гэта сопка. Вядома, як колішняя справа земляроба, уся таямнічасць граніцы. Колькі перажыта тут, колькі передумана... Два годы назад з групай аднагодкаў увайшоў ён з самаробным куфэркам на двор заставы. І тут — на далёкаўсходняй граніцы, у асяроддзі шчырых сяброў, у няспыннай вучобе, у баявых трывогах акрыліўся чалавек: сіла патроілася, мужнасць загартавалася, веды ўзбагаціліся.

Мільганула ў небе зорка. Паглядзеў на яе Пётр, потым: «Можа, яна і пад нашым сялом свеціць?» — падумаў. А сяло тое —на Палессі. Ад Мозыра, калі на Лельчыцы ехаць, дык яно на сярэдзіне шляху стаіць, ля заходняй граніцы. «Там відна яшчэ. Сонца ледзь на Захад ідзе. І, можа, вечарынка рыхтуецца. Васіль тустэп зайграе...»

Іграй, Васіль! Спакойна стаўляй сеці на Ціхім акіяне, рыбак!

Слухаў ноч Пётр Астахаў. І, можа здалося, а можа і не —нібы шоргат незвычайны пачуў. Напэўна здалося, бо нямая цішыня скоўвала ноч. Такая цішыня, што і самому паварушыцца нельга. Слухаў Пётр... У шэрань ноч апраналася.

Пляма з'явілася на зямлі. Нібы цень дрэва. Але ні дрэў, ні кустоў няма—камень. Прыклаў да пляча вінтоўку Пётр.

І растаяла ў ночы цень. Вецер прынёс подых ракі. Дзесьці ўскрыкнула птушка.

«Весяляцца сябры. Шуміць вечарынка там, у сяле. А ў Маскве б'е гадзіннік дванаццаць. Імчацца аўто па асфальту вуліц. А ў Крэмлі думае за ўсіх і клапоціцца пра ўсіх правадыр»...

Чорная постаць узнікла наперадзе. Хіснулася ў цемрадзі і пачала набліжацца.

«Не трэба пужаць, хай падыйдзе яшчэ» — падумаў Пётр Яшчэ крок, і яшчэ... І новыя постаці ўзняліся, выраслі з зямлі. Дзве, тры, чатыры... І справа, і злева...

Шэсцера супроць аднаго.

***

...Адзінаццаць месяцаў шнураваў па асфальту вуліц Джон. Ён думаў пра сінявокую Люсі і грузавую машыну. Сын шахцёра, ён атрымаў у спадчыну дужыя рукі і нешчаслівы лёс.

— Ходзіш, Джон? — спытаўся ў яго пры сустрэчы сябра з парахавога завода.

— Хаджу, — адказаў.

Раскурылі люлькі, паглядзелі адзін другому ў вочы. Сябра сказаў:

— Нашы едуць. Шэсцера. А ты — шофер грузавой машыны...

Памаўчалі. І Джон адказаў:

— Дзе сустрэцца?

Дамовіліся аб месцы і паціснулі моцна рукі.

Усю ноч капціў люлькай Джон шэрае неба, што навісла хмарай над шумным горадам. Шмат разоў праходзіў каля кватэры Люсі. Сустракаўся са строгім позіркам чорных вачэй вокнаў і ішоў назад, у шматгалосы натоўп. На світанні ў ліку грузчыкаў прайшоў у порт.

Ішлі дні. Бюро дапамогі закрэсліла ў сваіх спісах Джона з прычыны парушэння ім правіл, — няяўкі. І Люсі беспаспяхова пыталася, куды знік Джон. А праз тры месяцы лонданская профсаюзная газета апублікавала ў аддзеле «Падзеі ў Іспаніі» інфармацыю, у якой карэспандэнт паведамляў аб гераічнай інтэрнацыянальнай брыгадзе і мужнасці танкіста Джона.

У адным з баёў быў адбіт у ворага танк. Экіпаж у паніцы разбегся, кінуўшы машыну. Джон падышоў да танка, пастукаў пальцам па брані. Потым абцёр пот з ілба, запаліў люльку і палез на месца вадзіцеля. Пасядзеў, памеркаваў і ўключыў газ. Танк папоўз па каменнях руін ускраіны горада.

Так Джон, былы шофер грузавой машыны, стаў танкістам.

На аточаных кіпарысамі палях, дзе спеюць сонечна-яркія лімоны і бягуць ціхія рэчкі, на палях Каталоніі быў бой. Трупы шчодра кладліся на зямлю, як зерне з рук сейбіта.

Танк Джона руйнаваў кулямётныя гнёзды. Гучалі баявыя, натхнёныя воклічы англічан, немцаў, французаў, — воклічы, якія перакладаюцца нашым кароткім «ура». Ішлі ў атаку байцы інтэрнацыянальнай брыгады. За зямлю вольнай Іспаніі, за праўду і мір...

Пабеглі з поля боя мараканцы, адышлі італьянцы, дрогнулі немцы... А камандзір рэспубліканцаў, усхваляваны і здзіўлены загадам цэнтра, мусіў з болем у сэрцы даць каманду: «Спыніцца! Адыйсці...»

Нечаканасць спынення атакі збянтэжыла супраціўніка. Усталявалася цішыня.

А раніцою — з візгатам рынуліся мараканцы, са злавесным «гоханнем» пайшлі немцы і коршыкамі закружылі «Гейнкелі»...

Танк Джона быў абкружан у цеснай вуліцы маленькай і мёртвай вёскі. Мараканцы, як мурашкі, абляпілі танк. Білі браню, стралялі ў шчыліны. Потым аблілі газай. Факелам успыхнуў маўклівы танк...

***

Яны стаялі на трыбуне Краснай плошчы — Пётр і Джон, глядзелі ўсхвалявана і ўзрадавана ў вочы адзін другому.

— Мы прайшлі-б... Але здрада, подлая здрада! — Губы Джона дрогнулі ад болю. — Я расказаў сваім сябрам пра ўсё. Яны зразумелі. Мы сціснулі кулакі і пакляліся... Потым, памаўчаўшы, спытаўся:

— Ты-ж не ўсё сказаў пра сябе, Пётра. Супроць цябе было шэсцера...

— Спатрэбілася крыху знаходлівасці. Я пачаў камандаваць, нібы са мной быў узвод, і ўсіх шасцярых прывёў на заставу... Як вырваўся ты з кіпцюроў смерці, Джон?

— Я імкнуўся рабіць так, як робяць совецкія пагранічнікі. Пакуль былі патроны — біў. Кулямёт праперабіў сцежку, і я вывеў танк. Толькі не ўбярог ад агню галасоў. Яны так падабаліся Люсі...

Сонца ўсцілала шлях калонам. Паўз ленінскі маўзалей ішлі грузіны і украінцы, кітайцы і дзеці іспанцаў.

— Але я не ўсё зрабіў, — дадаў Джон. — І я еду ў Кітай. Там не лішнім будзе танкіст Джон. Ты будзеш ахоўваць совецкую зямлю, і я там... — мы будзем біць аднаго ворага. І Люсі так сказала: б'ючы самураяў, ты будзеш біць Гітлера, будзеш біць палітыку Чэмберлена.

Ішлі калоны праз Красную плошчу. Зіхацела ў праменях сонца сталь штыхоў і шматколер'е кветак. Джон глядзеў на таго, да каго імкнуцца сэрцы і думы людзей працы на ўсёй зямлі.

— Што сказаў-бы таварыш Сталін мне? — ціха спытаўся ён.

Пётр паціснуў мужную руку сябра:

— Ён сказаў-бы: ты правільна робіш, ты — цудоўны таварыш, Джон.

Алесь СТАХОВІЧ

У ФУТРАВЫМ МАНТО

НАВЕЛА

Клара ўстала з канапы, абабітай цёмнай у вялікія фантастычныя лілеі матэрыяй, і, зябка паводзячы плячыма, пачала хадзіць па маленькаму пакою. Яна падышла да люстра, якое вісела ля вакна ў старамоднай бронзавай аправе, і на яе глянула высокая, стройная дзяўчына з вялікімі светлымі косамі і прыгожым ружовым тварам. Клара ўсміхнулася і на яе шчаках з'явіліся дзве маленькія, ледзь прыкметныя ямачкі, а радзімка на правай шчацэ крыху перасунулася вышэй к вуху. Яна прайшлася колькі разоў па халоднаму нятопленаму пакою, захінаючыся ў пуховую хустку, і зноў села на канапу.

За вокнамі дзіка завываў парывісты лютаўскі вецер.

— Дррр! Дррр! — нудна шорхаўся аб дах адарваны кавалак бляхі.

Спіснуўшы далонямі віскі, Клара пачала правяраць вучнёўскія сшыткі. Яны ляжалі побач з ёю на канапе. Але рукі мёрзлі ад холаду і аловак часта выпадаў з дзервянеючых, пачырванелых пальцаў.

— Цік-цік!.. Цік-цік!.. — рытмічна адбіваў над Кларынай галавой насценны гадзіннік.

— Рыта Шыссер... — прашапталі пасінелыя ад холаду губы Клары. і яна, як жывую, уявіла сабе гэту шчупленькую дзяўчынку, у якой нядаўна памерла маці, пакінуўшы Рыце яшчэ маленькага браціка. Рыта заўсёды адасаблялася ад дзяцей, і часта ў кутку класа Клара гладзіла яе мяккія, рассыпчатыя валасы.

— Роза Крафт... Добрая вучаніца, — падумала Клара, і быццам з гэтага сшытка на яе глянулі вясёлыя, хітраватыя вочы шустрай дзяўчынкі. Яна заўсёды малявала карыкатуры на дырэктара, які перш, чым пачаць гаворку, заўсёды меў звычку гучна смаркацца ў беласнежную хустачку.

— Бом!.. Бом!., — хрыпла прazваніў гадзіннік. Клара акуратна склала правераныя сшыткі, устала з канапы, пазяхнула і, кульгаючы на замлеўшую нагу, падышла да ложка. Са сцяны на яе глянуў знаёмы твар Генрыха. Ён дабрадушна ўсміхаўся, прыплюрыўшы шэрыя вочы. Распрануўшыся, Клара шмыгнула пад халодную коўдру. Падкурчыўшы пад сябе ногі, яна марыла аб Генрыху, аб надыходзячым вяселлі... Вось толькі няхай ён скончыць вучобу і ўстроіцца на працу, а тады... тады яна зажыве другім жыццём...

Часта, калі Генрых адыходзіў дадому, Клара непрыкметна хавала яму ў кішэню бутэрброд. І нават учора Генрых, седзячы вось на гэтай канапе, смеючыся, расказваў Клары аб нейкай пудоўнай добрай феі, якая кладзе яму ў кішэні бутэрброды, — раніцою ён знаходзіў іх у сваім піджаку.

***

Была халодная берлінская раніца. У кароценькай футравай куртцы Клара спяшалася ў школу. Яна задыхалася ад пякучага марознага паветра, якое калола, шчыпала яе пачырванеўшы твар, забіралася пад полы кароценькай курткі, кусала кончыкі вушэй, якія паказваліся з-пад густых залацістых валасоў. Ідучы паўз вітрыну футравага магазіна, Клара ўбачыла пушыстае шэрае футравае манто.

«Вось мне-б такое!..» — падумала Клара, і, глянуўшы на бясэнсавы твар манекена, хутка пайшла далей па шумнай вуліцы. Машыны шуршалі па гладкаму асфальту, а белыя сняжынкі, падаючы, кружыліся ў паветры, наскакваючы адна на другую ў нейкім дзікім вар'яцкім танцы... Снег казытаў Кларыны шчокі, асядаў на доўгіх загнутых веках, засыпаў іскрыстым пухам яе выцертую куртку.

Вось і школа. Але што гэта? Каля жалезнай брамы, заўсёды ветліва расчыненай насцеж, зараз стаяў вайсковы з ружжом у руках.

— Ваш пропуск? — запытаўся ён у Клары.

— Які пропуск? Навошта? — здзівілася Клара, не разумеючы пытання вайсковага.

— Зараз тут казарма, без пропуска нельга!

— А школа?

— Ніякай тут школы няма, разумееце?! А ну, праходзьце!

— Раз, два... раз, два...—пачула Клара каманду, пад якую на былой школьнай пляцоўцы шпацыравалі штурмавікі.

Клара разгублена стаяла ля брамы. Ёй здавалася, што яна бачыць нейкі страшны, непрыемны сон. Папраўляючы валасы, якія выбіліся з-пад шапачкі ад хуткай хады, яна правяла рукой па мокраму ўспацеламу ілбу і, азіраючыся назад, пайшла прэч.

— Казарма!.. — здзіўлена прагаварыла Клара. — Учора была школа, а сёння... Яна сціснула кулакі і з такой нянавісцю зірнула на праходзіўшага паўз яе тоўстага ў вайсковым адзенні чалавека, што той, увабраўшы галаву ў плечы, зморшчыўся і падаўся ў бок ад Клары. Снег падаў павольней і павольней, і толькі запазадалыя сняжынкі марудна кружыліся ў марозным паветры... К горлу Клары падступалі нейкія балючыя камячкі. Яны мімаволі сціскалі яе шыю, займалі дыханне, а ў галаве стаяла неадчэпная думка: «Што я зараз буду рабіць, што скажу Генрыху?... А вяселле?...»

***

Вуліцы былі заліты моцным электрычным святлом. То там, то сям успыхвалі светлавыя рэкламы.

Генрых бязмэтна ішоў па вуліцы, часта спыняўся ля вітрын, каб хоць гэтым запоўніць свой вечар, які без Клары цягнуўся гэтак марудна і сумна. Апошні час ён пачаў заўважаць, што Клара нешта хавае ад яго і кожны вечар ходзіць быццам да сваёй таварышкі, а між тым катэгарычна забараняе праводзіць яе.

Непрыкметна Генрых апынуўся перад буйным футравым магазінам. У вітрыне, прыгожа задрапіраванай фіялетавым аксамітам, стаяла жанчына ў шэрым футравым манто. Грацыёзна ўзняўшы руку з штучнай кветкай, яна павольна паварачвалася, каб прывабіць пакупніка, наказаць яму ўсю прыгожасць залежалага футравага манто.

Генрых бачыў перад сабою стройную фігуру з белакурымі валасамі, скручанымі ў тугі валік, у шэрай шапачцы з таз-ж самае футры, што і манто.

«Такое манто я калі-небудзь куплю Клары...» — падумаў Генрых і на яго засмучаным твары ўспыхнула радасная ўсмешка. Жанчына павольна паварачвалася, і раптам усмешка знікла з твару Генрыха. Вочы яго зрабіліся круглымі і ён нібы застыў ля зіхацеючай электрычнасцю вітрыны.

Перад ім стаяла Клара. З штучнай, нацягнутай усмешкай на губах, яна павярнулася да публікі, якая тоўпілася ля вітрыны. У правай прыўзнятай руцэ яна трымала алую, як яе губы, гваздзіку.


Генрых міжволі ўскрыкнуў. Клара пачула гэты крык, здрыганулася і, пазнаўшы Генрыха, які глядзеў на яе праз шкло вачыма, поўнымі роспачы і жаху,— пахіснулася ў бок, але стрымаўшыся, зноў стала сур'ёзнай, і толькі вочы — знаёмыя, зялёныя вочы колеру марской вады — напоўніліся слязьмі.

Не, гэта сон, дзікі кашмар! — супакойваў сябе Генрых. Але радзімка, знаёмая радзімка на левай шчацэ, лішні раз сцвярджала Генрыху, што перад ім яго Клара...

«Што гэта? Розум я трачу, ці што?»— пытаўся сам у сябе Генрых.

— Не, гэта не Клара! — шапталі яго збялелыя ад болю губы.

Гэта была Клара.



«ЛЕНІН і СТАЛІН». Манументальная скульптура засл. дзеяча мастацтваў БССР З. Азгура для Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі ў Маскве.
Фота І. Каплінскага.

Растучы майстар скульптуры

За 21 год свайго развіцця скульптура Савецкага Саюза дасягнула вялікага росквіту. Савецкая скульптура стала масавым народным мастацтвам. Вялікая армія мастакоў-скульптараў працуе над вобразамі правадыроў рэвалюцыі, над вобразамі лепшых людзей нашай краіны. Сярод плеяды маладых савецкіх скульптараў БССР адно з першых месц займае заслужаны дзеяч мастацтваў Заір Ісакавіч Азгур.

Нарадзіўся тав. Азгур у 1908 годзе ў Віцебскай губерні. Першае знаёмства з пластычнай масай — глінай ён атрымоўвае ў ганчарнай майстэрні віцебскага саматужніка. Далей ідзе вучоба ў практычным ізоінстытуце Віцебска. Першыя ўрокі скульптуры тав. Азгур бярэ ў мастака А. М. Бразэра. Інстытут пераарганізоўваецца ў тэхнікум. Кіраўніцтва скульптурай у тэхнікуме даручаецца скульптару М. А. Керзіну. Асноўны творчы кірунак гэтага майстра — рэалістычнае адлюстраванне рэчаіснасці. Ён змагаецца за рэалістычнае мастацтва. Тав. Керзін змог прывіць вучням любоў да рэалізма, да сапраўднай прыроды, да натуры.

Пасля сканчэння тэхнікума тав. Азгур паступае ў Ленінградскую Акадэмію мастацтваў. Але творчая накіраванасць скульптара не атрымоўвае патрэбнага падтрымання ў Акадэміі, бо ўплывы фармалізма пранікаюць і туды. Азгур кідае вучобу ў Акадэміі. Пачынаецца самастойная праца. Работа на Украіне і Каўказе, у Тбіліскай Акадэміі мастацтваў узбагачае вопыт скульптара.

На першай усебеларускай выстаўцы ў 1925 годзе ўпершыню перад беларускай грамадскасцю паяўляюцца яго работы — эцюды-партрэты натуршчыкаў. На фоне тагочаснай стылізаванай, скажонай фармалістычнымі мудраваннямі скульптуры гэтыя работы неслі ў сабе пачатак здаровага, рэалістычнага ўспрыняцця рэчаіснасці. Гэтыя ўласцівасці першых крокаў яго творчасці сталі асновай яго далейшага шляху.

Адлюстраваць жыццё людзей нашай эпохі, паказаць іх сродкамі мастацтва — асноўная ідэя скульптара. Паказаць людзей сталінскай эпохі, якія ідуць к камунізму — ганаровая задача савецкага мастака.

Цікава адзначыць, як паступова скульптурны партрэт, выражаны спачатку адной галавой, кампазіцыйна ўзбагачаючыся, вырастае ў партрэтную статую і, нарэшце, завяршаецца складанай многафігурнай кампазіцыяй. Такі шлях скульптара-кампазітара тав. Азгура.

Вобразы Леніна, Сталіна, Орджанікідзе, Дзяржынскага, Кагановіча, — вось асноўныя крыніцы творчага парыву скульптара. Першымі адказнымі працамі Азгура, як майстра, можна лічыць бюсты Бабефа, Дзяржынскага і Мяснікова, зробленыя ім для параднай лесвіцы СНК БССР у Доме Ўрада. У гэтых працах скульптарам добра вырашаны задачы манументальнага партрэта. Асабліва добры бюст Бабефа, — волевыя якасці бунтара выяўлены тут з усёй сілай. З партрэтаў пазнейшай работы неабходна адзначыць бюст прафесара-псіхіятара, псіхалагічны вобраз якога раскрыт у дасканаласці.

Вобраз таварыша Сталіна стаў асновай работы скульптара. Упарта і настойліва ідзе мастак да вырашэння гэтай ганаровай, адказнай і цяжкай задачы. Цяпер ён вырашае складаную задачу манументальных групавых партрэтаў Леніна і Сталіна, Маркса і Энгельса.

Задача паказу групавога партрэта з двух фігур надзвычай цяжкая. Аднак, скульптару, які працуе зараз над групай Ленін і Сталін, удалося кампазіцыйна яе вырашыць. Спалучэнне фігур Леніна і Сталіна ўпаўне апраўдана і ідэйна і кампазіцыйна. Ідэйная накіраванасць гэтага групавога партрэта, выражанага рэалістычнымі формамі ў вялікіх манументальных планах, упаўне адпавядае задачам манументальнай прапаганды высокіх ідэй нашай эпохі.

А. ГРУБЭ,
заслужаны дзеяч мастацтваў.

Міхась КАЛАЧЫНСКІ

НАРОДНЫ СТАЛІН

Над сонцам Грузіі, дзе горы
Блішчаць абрусам снегавым,
Стаіць пасёлак светлы Горы
І домік Сталіна у ім.

Адсюль рака Кура далёка
Аж к мору Чорнаму ідзе,
І з домікам чынар высокі
Бяседу вольную вядзе.

Ты чуў тады — у рог загнуты
Ігралі гулка пастухі, —
А ў песнях тых народны смутак
Кранаў цябе, як боль глухі.

Любіў грузінскую прыроду,
Адчуў душой журбу людзей,
Імкнуўся змоладу к народу,
Бы к мацеры-зямлі Антэй.

Салдат, чырвоны палкаводзец,
Марак, рабочы, аратай, —
Такім жывеш ты у народзе,
Грыміш у славе з края ў край.

Як рэкі чыстыя струмені
Бяруць з азёр і стромкіх гор,
Так мы надзеі і імкненні
Бяром у Сталіна свайго.

Як сонца дорыць, шле спрадвеку
Цяплынь зямлі — лясам, палям,
Так дорыш ласку чалавеку
Ты, Сталін сонечны, з Крэмля:

Дзяцей, як бацька абнімаеш,
Прыходзіш к ім у дом, у сад
Ім падарункі пасылаеш —
Грузінскі спелы вінаград.

Калі у нас бывае гора,
Мы не ўнураем галаву, —
Мы ўспамінаем слаўны Горы,
К табе мы едзем у Маскву.

І ты ў бядзе дапамагаеш,
Руку ў няшчасці падаеш,
Усё умееш, можаш, знаеш,
Для нас і мысліш і жывеш.

Народны Сталін, мудры Сталін!
— У бой! — нам, воінам, скажы, —
Сцяной несакрушальнай станем
За родны край, за права жыць.

Аркадзь ГЕЙНЕ

МАГЧЫМАЯ СУСТРЭЧА

Праз вакно трамвая аднойчы
Цёплым, свежым вясенным днём
Я убачыў: маленькі хлопчык
Нахіліўся над ручайком.

Ён старанна і цярпліва
Будаваў перашкоды вадзе
І з усмешкай дзіцячай шчаслівай
На свае пабудовы глядзеў...

Я праехаў...
І, можа, ніколі
Не сустрэнуся болей з ім.
Ён вучыцца будзе у школе,
Каб даведацца аб усім.

Многа вёсен пройдзе. У рэках
Безліч сыйдзецца ручайкоў...
У газеце партрэт чалавека
Я убачу праз шмат гадоў.

Стане ўсёй краіне аблічча
Інжынера вядома таго.
І з самім Леанардо да-Вінчы
Параўноўваць будуць яго.

Я на хвілю прыплюшчу вочы
І прыпомню: вясенім днём
Клапатліва маленькі хлопчык
Будаваў штось над ручайком;

Сонца праменямі сагрэты,
Ён смяяўся...
І, можа быць,
Гэта ён на мяне з партрэта,
Як знаёмы даўно, пагляд зіць...

Леанід КРУЦІЛАЎ

ОЙ, КАТОРАГА ЛЮБІЦЬ?

Выйду ў поле я з сярпом
Ранішняй парою —
Брыгадзір Васіль цішком
Крадзецца за мною.

Я пайду на сенажаць,
Сена саграбаю —
Брыгадзір дапамагаць
З граблямі спяшае.

Ён грабе і падміргне,
Позірк заіскрыцца...
Мо' здалося гэта мне?
Каб не памыліцца...

Вечарамі трактарыст
Ходзіць каля хаты,
Трактарыст, і гарманіст,
І танцор заўзяты.

Кліча песняю мяне
Выйсці пагуляці,
Як зайграе, запяе —
Не ўсядзець у хаце.

Я не знаю, што рабіць,
Лягу спаць — не спіцца,—
Ой, каторага любіць,
Каб не памыліцца?

Тодар КУРБЭЦКІ

ПАЖАДАННЕ

Мне здаецца, мы учора
З пугай бегалі даўгой
Па далінах, па разорах —
За рагатай чарадой,

Усё мне гэта прыгадалі
Поле, рэчка ды лужкі,
Дзе калісьці сябравалі
Два малыя пастушкі.

...Ты сустрэўся, мой каханы,
З добрай доляй на вяку.
От, ідзеш такі прыбраны
Ды з нявестай пад-руку.

Мне казала маладая,
Што вяселлю хутка быць.
Шчыра вам, сябры, жадаю
Дзетак з васьмера нажыць.

Каб у вас у кожна лета,
На прыгожы час такі,
Нараджаліся паэты,
Брыгадзіры, маракі.

Ю. ДВОРКІНА

РАСТУЦЬ РАДЫ ЛІТАРАТАРАЎ-АНТЫФАШЫСТАЎ

У сваім дакладзе на XVIII з'ездзе ВКП(б) тав. Мануільскі даў бліскучую характарыстыку значэння апошняга пяцігоддзя ў гісторыі сусветнага рэвалюцыйнага руху. Тав. Мануільскі сказаў: «Па меры пераходу фашызма ў наступленне ў асобных краінах і на міжнароднай арэне, расце, пашыраецца і прымае ўсё больш міжнародны характар антыфашысцкі рух. Пяцігоддзе паміж XVII і XVIII з'ездамі напоўнена буйнымі антыфашысцкімі баямі працоўных. Гэта — магутная барацьба працы супроць капітала, сіл прагрэса супроць цёмных сіл рэакцыі. Гэта — паласа барацьбы компартый за адзінства дзеянняў рабочага класа, за адзінства профруху, за антыфашысцкі народны фронт».

У адзіны фронт барацьбы супроць фашызма актыўна ўключаюцца і лепшыя прадстаўнікі буржуазнай інтэлігенцыі, лепшыя дзеячы сусветнай культуры.

Пачатак сусветнага эканамічнага крызіса—1929 год — можна лічыць і пачаткам актыўнага павароту заходнееўрапейскай інтэлігенцыі ў бок Савецкага Саюза. 30-я гады на Захадзе асабліва ярка агалілі перад дзеячамі культуры ўсю гніль і разлажэнне буржуазнага грамадства, гібель яго культуры. Інтэлігенцыя Захада пераканалася ў тым, што толькі адна краіна ў свеце, краіна перамогшага сацыялізма, перажывае небывалы да гэтага часу ў гісторыі чалавецтва росквіт культуры, навукі і мастацтва, што толькі Савецкі Саюз з'яўляецца краінай сапраўднага гуманізма, краінай, дзе створаны ўсе ўмовы для развіцця творчых сіл і здольнасцей чалавечай асобы.

Вядомы зварот А. М. Горкага «З кім вы, майстры культуры?» знайшоў жывейшы водгук у сэрцах лепшых прадстаўнікоў сусветнай інтэлігенцыі. На заклік А. М. Горкага першым адгукнуўся адзін з лепшых майстроў культуры, французскі пісьменнік Рамэн Ралан, які заявіў у артыкуле «Развітанне з мінулым» аб сваёй глыбокай дружбе і любві да Савецкага Саюза, аб тым, што ён знайшоў сваё месца сярод змагароў за шчасце чалавецтва. У сваім пісьме ў ВОКС ён пісаў: «Глядзіце на мяне, як на вяшчуна новага Захада, які ідзе да вас». Лепшыя прадстаўнікі сусветнай інтэлігенцыі паследавалі за Раланам па шляху збліжэння з ідэямі комунізма.

Па гэтаму шляху ішоў таксама і французскі пісьменнік Анры Барбюс, які стварыў кнігу аб вялікім правадыру ўсіх працоўных, кнігу «Сталін», ідуць па ім Арагон, Нізан, Кассу, Жан-Рышар Блок, Мальро і інш.

Яшчэ больш рэзка намеціўся паварот улева сярод сусветнай гуманістычнай інтэлігенцыі пасля 1933 года, пасля захопу ў Германіі ўлады фашыстамі, калі фашысцкая небяспека стала рэальнай і пагражаючай усяму свету, калі фашысты сталі варварскімі метадамі сярэдневяковя распраўляцца з рабочымі, з рэвалюцыйнымі і палітычнымі дзеячамі і проста з людзьмі культуры, мастацтва. Фашысты адкрыта паказалі, што яны ворагі культуры і інтэлігенцыі. У фашысцкіх засценках было замучана шмат пісьменнікаў, як Нейкранц, Эрых Мюзам, Карл Осецкі. Там пабывалі Людвіг Рэнн, Вілі Брэдэль. Ужо 6 год пакутуе там лепшы сын нямецкага народа правадыр германскай компартыі Эрнст Тэльман. Фашысцкія варвары выгналі з краіны тысячы славутых вучоных і пісьменнікаў.

Фрыдрых Вольф сваёй п'есай «Прафесар Мамлок», Лангкоф — «Балотнымі салдатамі», Ліон Фейхтвангер—«Сям'ёй Опенгейм» і «Выгнанцам» паказалі ўсяму свету, як распраўляецца фашызм з лепшымі людзьмі Германіі. Яны паказалі, што сапраўдныя гуманісты маюць перад сабою адзін толькі шлях — шлях уключэння ў адзіны антыфашысцкі фронт барацьбы.

І, сапраўды, скліканы па ініцыятыве Горкага, Барбюса і Ралана ў 1935 годзе ў Парыжы Кангрэс абароны культуры прыняў ярка выражаны антыфашысцкі характар. Многія дзеячы сусветнай культуры выступілі на кангрэсе з гарачымі заклікамі да барацьбы супроць фашысцкай рэакцыі, варварства і мракабесся.

Старшынствуючы на кангрэсе нямецкі пісьменнік Генрых Манн заявіў аб сваёй адданасці Савецкаму Саюзу, аб тым, што «толькі марксізм стварыў глебу для сапраўднай дэмакратыі». Сваімі творамі пісьменнікі-антыфашысты актыўна ўключыліся ў справу выкрыцця фашызма, паказалі ўсяму свету жахі фашысцкага тэрору, зверскую расправу над лепшымі сынамі нямецкага народа.

Гэта тэма знайшла сваё адлюстраванне найбольш поўна ў нямецкай антыфашысцкай літаратуры. Гэта літаратура ствараецца цяпер пісьменнікамі-эмігрантамі, якія, жывучы далёка ад сваёй радзімы, тым не менш з'яўляюцца сапраўднымі выразіцелямі пачуццяў і імкненняў нямецкага народа. Па розных краінах свету рассеяны гэтыя пісьменнікі, але мыслі і пачуцці іх адзіны. Гэта — пачуццё нянавісці да фашызма, злейшага ворага нямецкага народа, гэта вера ў тое, што нямецкі народ пераможа, у канцы канцоў, сваіх прыгнятальнікаў.

Аб гэтым пішуць такія пісьменнікі, як Вілі Брэдэль — у раманах «Выпрабаванне», «Твой невядомы брат», Фрыдрых Вольф — у п'есах «Прафесар Мамлок», «Траянскі конь», Анна Зегерс, Бехер, Вайнерт, Фейхтвангер, аб гэтым пішуць у сваіх публіцыстычных творах Генрых Манн і Томас Манн, аб гэтым напісаў французскі пісьменнік Андрэ Мальро ў сваім творы «Годы знявагі».

Варта адзначыць у антыфашысцкіх пісьменнікаў узросшую цікавасць да жанра гістарычнага рамана. Генрых Манн напісаў выдатныя раманы «Юнацтва Генрыха IV» і «Сталыя годы Генрыха IV»; Ліон Фейхтвангер выступіў з сваім «Лжэ-Неронам»; Густаў Рэглер напісаў раман «Пасеў» — пра эпоху сялянскіх войн у Германіі; Жан Кассу выдаў «Крывавыя дні Парыжа» і г. д. На гістарычным матэрыяле ставяць яны праблемы сённяшняга дня, узнімаюць гуманістычныя ідэалы мінулага для выкарыстання іх у барацьбе з сучасным мракабессем і варварствам.

Фрыдрых Вольф у сваёй п'есе «Фларыдсдорф» і Анна Зегерс у рамане «Шлях праз люты» адлюстравалі геройчную барацьбу аўстрыйскіх працоўных супроць спробы фашысцкага перавароту ў 1934 годзе.

Калі ў 1936 годзе пачалася фашысцкая інтэрвенцыя ў Іспаніі, усе сімпатыі антыфашысцкага фронта былі на баку іспанскіх рэспубліканцаў. Многія пісьменнікі-антыфашысты, узяўшы зброю ў рукі, паспяшылі на дапамогу змагарам рэспубліканскай Іспаніі. У інтэрнацыянальных батальёнах змагаліся такія пісьменнікі, як Людвіг Рэнн, Густаў Рэглер, Вілі Брэдэль, Мархвіца, Эрых Вайнерт, туды паспяшыў вядомы выканавец нямецкіх рэвалюцыйных песень Эрнст Буш, там змагаліся Матэ Залка (генерал Лукач), Андрэ Мальро, Ральф Фокс, Джон Карнфорд. Правядзенне другога Міжнароднага кангрэса рэвалюцыйных пісьменнікаў у Валенсіі таксама з'явілася дэманстрацыяй сімпатый да рэспубліканскай Іспаніі з боку антыфашысцкіх пісьменнікаў.

Нездарма тэма барацьбы іспанскага народа супроць фашысцкіх агрэсараў загучала ў творах пісьменнікаў розных краін. Эптон Сінклер, Хэмінгуэй, Вілі Брэдэль, Андрэ Мальро, Жан-Рышар Блок, Эрых Вайнерт, Лэнгстон Х'юз і іншыя паказалі, што фронт антыфашысцкай барацьбы праходзіць па ўсяму свету, што вайна супроць фашысцкай агрэсіі дзе-б там ні было — ёсць вялікая і справядлівая вайна.

Гераічная барацьба іспанскага народа выклікала росквіт іспанскай рэвалюцыйнай антыфашысцкай літаратуры. Імёны іспанскіх пісьменнікаў Рафаэля Альберці і яго жонкі Марыі-Тэрэсы Леон шырока вядомы савецкаму чытачу. Аўтарам шматлікіх раманаў, якія адлюстроўваюць жыццё і барацьбу іспанскага народа на працягу апошняга дзесяцігоддзя, з'яўляецца пісьменнік Рамон-Хозе Сендэр. Пісьменнік Бенавідэс, вядомы савецкаму чытачу па хранікальнаму раману «Апошні пірат Сярэдземнага мора», напісаў цяпер раман «Злачынства Еўропы». Многа пісалі аб жыцці іспанскага народа Х. Ардэрыус і С. М. Арконада. Паэт Мануэль Альтоляррэ, Пля-і-Бельтран, Фернандо Гарсія Лорка, Альберці і іншыя паказалі ўсяму свету гераічнае аблічча іспанскага народа, так ашуканча здраджанага «дэмакратычнымі» дзяржавамі Еўропы.

Гэты гераічны народ не змаглі зламіць у адкрытым баю фашысцкія інтэрвенты і зрабілі гэта толькі пры дапамозе тройчы праклятых трацкісцкіх і іншых здраднікаў, якія нанеслі рэспубліканцам удар у спіну. Але факты гераічнай барацьбы іспанскага народа, кнігі і дакументы аб гэтай барацьбе сведчаць аб тым, што не доўгім будзе таржаство гнуснай фашысцкай зграі, што ёй не ўдасца ўтрымацца на спіне гордага, свабодалюбівага народа.

Падзеі ў Іспаніі яшчэ больш умацавалі гатоўнасць да барацьбы ў радах антыфашысцкага фронта, яшчэ больш згуртавалі вакол Савецкага Саюза, як аплота міру, усе элементы сусветнай дэмакратыі. Нават такія пісьменнікі, як Уэллс, Монтэрлан, Марыак і г. д., якія лічылі сябе апалітычнымі, актыўна выступаюць цяпер супроць фашысцкай агрэсіі, якая нясе з сабою гібель культуры, разбурэнне цывілізацыі, нечуваныя пакуты народным масам. Гатоўнасць да барацьбы асабліва ярка прагучала ў апошнім выдатным творы чэхаславацкага пісьменніка Карла Чапека, у п'есе «Маці», адным з лепшых сучасных антыфашысцкіх твораў.

Гэтая-ж тэма раскрываецца італьянскім пісьменнікам-комуністам Джэрманетто ў яго рамане «Травальё».

Вялікае месца ў літаратуры ў наш час займае гераічная барацьба кітайскага народа супроць японскіх захватчыкаў. Усе дэмакратычныя элементы Кітая згуртаваліся ў барацьбе супроць сваіх ворагаў. Іх падтрымліваюць антыфашысты ўсяго свету. І ў Кітаі расце новая, рэвалюцыйная культура, у арміі праводзіцца велізарная агітацыйная работа, у якой актыўны ўдзел прымаюць пісьменнікі. Пісьменніца Цін Лін, пісьменнік Тянь Цзюнь (раман «Вёска ў жніўні»), нядаўна памёршы пісьменнік Лу-Сінь, паэт Эмі Сяо і іншыя адлюстроўваюць у сваіх творах жыццё і барацьбу кітайскага народа. Аб ёй пішуць і пісьменнікі іншых краін, як Анна Луіза Стронг, Кроу, Гарры Гэнніс і інш.

Вялікую цікавасць прадстаўляе сабою рост рэвалюцыйнай негрыцянскай літаратуры. Доўгі час пісьменнікі негрыцянскага народа тапталіся ў кругу спецыфічна «негрыцянскіх пытанняў», супроцьстаўляючы неграў белым наогул. Лепшыя прадстаўнікі негрыцянскай літаратуры, як Лэнгстон Х'юз, Рычард Райт, Энджэло Херндон, заклікаюць у сваіх творах працоўных неграў далучыцца да працоўных усяго свету ў барацьбе супроць сваіх ворагаў. У сваім аўтабіяграфічным творы «Я буду жыць» проста і праўдзіва расказаў аб сваім жыцці Энджэло Херндон, член ЦК комсамола Амерыкі. Ён расказвае сваім супляменнікам аб адзіна правільным шляху вызвалення забітага, змучанага, бяспраўнага негрыцянскага народа. Шлях гэты — шлях уключэння ў адзіны антыфашысцкі фронт барацьбы. Аб жыцці і лёсе негрыцянскай моладзі вельмі ярка і таленавіта расказаў пісьменнік Рычард Райт у сваіх навелах, аб'яднаных назвай «Дзеці дзядзькі Тома».

Прадстаўнікі сусветнай інтэлігенцыі цяпер ужо наглядна ўбачылі, што ў бітвах нашага часу ніхто не можа стаяць у баку, лічыць сябе нейтральным, бо нейтралітэт — прамая дапамога рэакцыі.

Майстры культуры бачаць у Савецкім Саюзе ўвасабленне лепшых імкненняў прагрэсіўнага чалавецтва, бачаць у ім аплот міру і вышэйшае ўвасабленне гуманізма. Савецкі Саюз непахісна супроцьстаіць усім спробам сусветнага фашызма ўцягнуць усё чалавецтва ў новую імперыялістычную вайну, і гэта ўзмацняе сімпатыі ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва да краіны сацыялізма. Сусветная інтэлігенцыя, як і ўсё працоўнае чалавецтва, бачыць у таварышу Сталіне свайго друга і геніяльнага правадыра.

Вакол Савецкага Саюза з кожным днём шчыльней згуртоўваюцца сілы сусветнай дэмакратыі, расце, пашыраецца антыфашысцкі фронт, умацоўваецца ўпэўненасць у будучай перамозе прагрэсіўнага чалавецтва над цёмнымі сіламі фашысцкай рэакцыі, фашысцкага варварства.



Павільён СССР на Міжнароднай выстаўцы ў Нью-Ёрку. «Совецкія фізкультурніцы» — скульптура **Янсон-Манізер** (мрамар).

Фотахроніка ТАСС.

НОВЫЯ ЭСКІЗЫ

Мастацкі совет выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці» 23 красавіка зацвердзіў рад вельмі каштоўных эскізаў. З іх у першую чаргу хочацца адзначыць эскізы таленавітых беларускіх мастакоў Е. Зайцава і Н. Пашкевіча.

Зайцаў узяў надзвычай складаную тэму—«Уступленне Чырвонай Арміі ў Менск». Мяркуючы па эскізу, Зайцаў падышоў да гэтай тэмы з вялікай творчай смеласцю, раскрываючы урачыстасць перамогі і радасць сустрэчы Чырвонай Арміі насельніцтвам вызваленага горада.

Выключна смела, з вялікім творчым тэмпераментам падышоў да тэмы «Сталін у штабе Рэўваенсовета Заходняга фронта» і мастак Пашкевіч. Ярка і праўдзіва паказвае ён сустрэчу Сталіна з беларускімі чырвонымі партызанамі ў штабе Рэўваенсовета.

Як творчую ўдачу, варта адзначыць і эскіз скульптурнай коннай групы «Таварышы Варашылаў. Будзённы і Шчаданка на Паўднёва-Заходнім фронце», прадстаўлены скульптарам А. Глебавым.

Усяго 23 красавіка зацверджана 11 эскізаў мастакоў Н. Дучыца, Г. Дакальскай, Р. Гембіцкага, А. Волкава, Н. Аўчыннікава, С. Каткова, І. Мільчына і Сухаверхава.

А. Д.

Архітэктурныя выстаўкі

У першамайскія дні ў Менску адкрываецца выстаўка работ маладых архітэктараў Совецкай Беларусі. Планшэты праектаў будуць выстаўлены ў вітрынах магазінаў Менска. Будуць дэманстрыравацца праекты архітэктараў А. П. Воінава, В. Н. Вараксіна, Н. Е. Трахценберга. А. П. Брэгмана і інш. Шырока будуць прадстаўлены работы архітэктараў па планіроўцы гарадоў БССР.

Лепшыя работы гэтай выстаўкі будуць накіраваны ў Маскву, дзе ў маі адкрываецца усесаюзная выстаўка работ маладых архітэктараў.

НА ШЭЎЧЭНКАЎСКАЙ ВЫСТАЎЦЫ Ў КІЕВЕ

У дзевяці прасторных залах Акадэміі навук Украінскай ССР размясцілася рэспубліканская выстаўка, прысвечаная жыццю і творчасці Тараса Грыгоравіча Шэўчэнка.

Вялікая колькасць сабраных старанымі рукамі экспанатаў уваскрашае воблік мужнага паэта-рэволюцыянера, геніяльнага украінскага кабзара. У першай зале наведвальнікі палоўгу разглядаюць пажоўклую ад часу кнігу метрычных запісаў, у якой рукамі якогасьці пісарчука выведзена: «У сям'і прыгоннага Грыгорыя Шэўчэнка ў сяле Морынцы у 1814 годзе нарадзіўся сын Тарас». У гэтай-жа зале выстаўлена адзіная мэбля — драўляны стол і лаўка, якія знаходзіліся ў хаце Тарасавых бацькоў. Рад малюнкаў, скульптур, дакументаў характарызуюць маленства Тараса Грыгоравіча.

Асобна сабраны першыя малюнкі, зробленыя Тарасам Грыгоравічам тайком ад сваіх гаспадароў. Ёсць на выстаўцы карціна «Цыганка», за якую Шэўчэнка атрымаў сярэбраную медаль. Прадстаўлены і ўсе выданні паэтычных твораў Шэўчэнка.

Асаблівую ўвагу наведвальнікаў прыцягваюць дакументы, якія адлюстроўваюць адносіны царскіх сатрапаў да вялікага паэта, і сярод іх — уласнаручны надпіс цара аб забароне Шэўчэнка пісаць і маляваць у часе ссылкі.

Карціна мастака Беседзіна паказвае Шэўчэнка сярод яго лепшых сяброў і аднадумцаў — вялікіх рускіх дэмакратаў Чэрнышэўскага, Дабралюбава, Некрасава.

Вялікую цікавасць уяўляе раздзел выстаўкі «Любоў совецкага народа да Шэўчэнка». Сотні карцін, малюнкаў на керамічных вырабах, гравюр, скульптурных работ малююць павагу совецкага народа да славутага кабзара. Яшчэ больш падкрэсліваюць гэту любоў народа выстаўленыя тут узоры выданняў твораў Шэўчэнка на мовах дзесяткаў нацыянальнасцей СССР, макет помніка, пастаўленага украінскім народам свайму песняру ў Харкаве.

Выстаўка сведчыць аб вялікай любві украінскага народа да свайго выдатнага песняра, аб вялікай папулярнасці, якой карыстаецца ў совецкіх людзей Тарас Грыгоравіч Шэўчэнка.

Кіеў (наш. кар.). **В. ГАЛЕНКА.**



КАНЦЭРТНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ КАНСЕРВАТОРЫІ

У гэтым навучальным годзе Дзяржаўная кансерваторыя БССР даволі шырока разгарнула канцэртную работу як у сваіх сценах, так і на перыферыі. Прыезд у Менск такіх відных педагогаў-канцэртантаў, як прафесары Коган, Нейгауз, Рэнзін, якія спалучалі лекцыйна-метадычную работу з канцэртнай практыкай, шмат даў і педагогам і студэнтам. На такому-ж прынцыпу праводзілі ў радзе гарадоў (Віцебск, Гомель, Магілеў) свае выступленні дацэнты Кансерваторыі Амітон і Клумаў, уносячы свежы струмень у жыццё музычных вучылішчаў і школ рэспублікі.

Неабходна адзначыць такое цікавае мерапрыемства, як выезд канцэртнай брыгады студэнтаў Кансерваторыі ў Гомель, дзе іх выступленне мела вялікі поспех сярод вучняў Гомельскага музвучылішча.

Адкрытыя канцэрты студэнтаў Кансерваторыі заваёўваюць усё большую ўвагу грамадскасці і даюць добрую выканаўчую практыку студэнтам.

У гэтым сэнсе даволі ўдала быў падрыхтаван канцэрт вакальнай кафедры, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння вялікага рускага кампазітара М. П. Мусоргскага. Канцэрт паказаў рост маладых вакалістаў (Петрачэнка, Фурс, Левіна), іх удумлівы і сур'ёзны падыход к рабоце. Асабліва хочацца адзначыць прадуманае выкананне «Калыханкі» студэнткай Фурс і гонкую, выразную, характэрную падачу цыкла «Дзіцячая» студэнткамі Левінай і Мурашка. Прыкметна вырас і як вакаліст і як выканавец студэнт Петрачэнка. Нас толькі не здаволіла яго выкананне «Семінарыста» і «Казла».

На другім канцэрце Кансерваторыі выступілі студэнты-піяністы.

Адкрытыя выступленні паасобных класаў Кансерваторыі трэба вітаць. Але, на нашу думку, рэпертуар выступленняў павінен будавацца альбо на паказе аднаго аўтара (Бетховен, Шапэн), альбо па напрамках, школах (класікі, рамантыкі і г. д.), што мае і ў педагагічным сэнсе і ў выканаўчай практыцы вялікае значэнне.

Зараз Кансерваторыя рыхтуецца паказаць сваіх лепшых студэнтаў у канцэртным выступленні ў Маскве. Гэта вельмі патрэбнае мерапрыемства, да якога дырэкцыі, педагогам і ўдзельнікам неабходна сур'ёзна рыхтавацца, каб як мага лепш паказаць працоўным сталіцы растучыя музычныя кадры БССР.

Неабходна, каб музычная грамадскасць больш глыбока занялася вывучэннем падрыхтоўкі кадраў і дапамагла Кансерваторыі вырашыць рад цяжкасцей з памяшканнем, інтэрнатам, папаўненнем і ўмацаваннем прафесарскага складу.

Н. Н.

ДА ФЕСТЫВАЛЯ КАЛГАСНА-СОЎГАСНЫХ ТЭАТРАЎ

БАБРУЙСКІ КАЛГАСНЫ ТЭАТР

Калгасна-соўгасныя тэатры, створаныя за апошнія годы, вядуць вялікую работу па культурнаму абслугоўванню працоўных раённых гарадоў, калгасаў і соўгасаў.

Адным з самых маладых калгасных тэатраў з'яўляецца Бабруйскі. Ён арганізаван у лютым 1938 года. У красавіку гэтага-ж года тэатр паказаў гледачу сваю першую пастаноўку — «Пагранічнікі» Біль-Белацэркоўскага. Спектаклямі і канцэртамі тэатр абслужыў раёны Бабруйскі, Асіпавіцкі, Кіраўскі, Жлобінскі і многія іншыя. Тэатр пабываў не толькі ў раённых цэнтрах, але ў калгасах, на заводах.

За час сваёй работы тэатр паказаў гледачам «Партызаны» К. Крапівы, «Прафесар Палежаеў» Рахманава, «Пагранічнікі» Біль-Белацэркоўскага «Не было ні граша, ды раптам алтын» Остроўскага. Зараз тэатр рыхтуе спектакль «Генконсул». Намечаны да пастаноўкі п'есы «Пагібель воўка» Эд. Самуйлёнка, «Корань жыцця» Штока, «Слуга двух паноў» Гальдоні.

У тэатры 18 актораў. Недастатковасць акторскіх сіл і адсутнасць кваліфіцыраваных актораў адбіваецца на творчай рабоце тэатра.

Калгасны глядач ведае і любіць свой тэатр. Але-ж плённай рабоце па абслугоўванню гледача тэатру перашкаджаюць часам адміністрацыі тых памяшканняў, дзе яму даводзіцца працаваць. Напрыклад, дырэктар кінотэатра ў Чавусах усяляк перашкаджаў рабоце тэатра, зрываў яго работу па абслугоўванню гледача. Такія факты не адзіныя.

Вялікую карысць павінны даць калгасным тэатрам шэфства над імі дзяржаўных тэатраў рэспублікі. Над Бабруйскім тэатрам шэфствуе Тэатр юнага гледача. На нашу-ж думку, шэфства над ім павінен узяць Рускі Дзяржаўны драматычны тэатр, які працуе ў Магілеве, у адной вобласці з Бабруйскам.

Увогуле трэба сказаць, што Бабруйскі тэатр ідзе па правільнаму шляху, творча расце і актыўна абслугоўвае гледача.

Г. КАЛАТНОВЕР.

АРТЫСТЫ ІЛЬІНСКІ І МАЛЧАНАЎ ПРЫНЯТЫ Ў ПАРТЫЮ

Пярвічная партыйная арганізацыя Віцебскага Дзяржаўнага тэатра аднагалосна прыняла народнага артыста рэспублікі А. К. Ільінскага і заслужанага артыста рэспублікі П. С. Малчанава кандыдатамі ў члены КП(б)Б.

ВІЦЕБСК, наш. спец. кар. **(Па тэлефону).**



АД ВАРШТАТА ДА МАЛЬБЕРТА

Два годы пры Доме народнай творчасці БССР існуе ўжо студыя выяўленчага мастацтва. У ёй дзве групы: малодшая— з 25 чал. і старэйшая — з 10 чал. Займаюцца праз дзень, па чарзе, амаль кожны вечар. Рабочыя, служачыя па 3 гадзіны цярпліва сядзяць за мальбертамі і авалодваюць адным з складанейшых відаў мастацтва — жывапісам. У малодшай групе праходзяць нацюрморт у малюнку і жывапісу, партрэт-накід, фігуру ў вопратцы; у старэйшай — нацюрморт, партрэт, аголеную натуру, — усё гэта ў малюнку і жывапісу. Пішуць эцюды. Распрацоўваюць эскізы да выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці». Слухаюць лекцыі па анатоміі (чытаюць праф. Голуб і доктар Орлова), аб перспектыве (мастак Абрамаў).

Сярод студыйцаў — людзі розных прафесій: токар па металу В. С. Янкевіч, работніца стаматалагічнай клінікі В. Ф. Крывашчокая, старшы бухгалтар Д. Л. Фішар, студэнт архітэктурна-будаўнічага тэхнікума А. Г. Аленскі, хатняя гаспадыня Н. П. Варвановіч, малодшы дэкаратар Тэатра оперы і балета Г. К. Чысты і інш.

Некаторыя з іх захапляюцца маляваннем з маленства, многія пачалі маляваць зусім нядаўна. Так было, напрыклад, з Верай Фёдараўнай Крывашчокай, якая толькі годы тры назад выпадкова выявіла ў сябе мастацкія здольнасці.

У совецкіх умовах перад народнымі самародкамі адкрыта шырокая дарога да ўдасканалення. Студыя выяўленчага мастацтва пры Доме народнай творчасці БССР дае ім поўную магчымасць без адрыву ад вытворчасці вывучаць жывапіс і малюнак. Большасць студыйцаў за 2 годы вучобы навучыліся добра маляваць, адчуваюць фарбу, дабіліся пэўных поспехаў у кампазіцыі. У студыі ёсць ужо каля 200 работ, якія маглі-б быць выстаўлены для грамадскага прагляду.

Дому народнай творчасці БССР трэба арганізаваць усебеларускую выстаўку лепшых работ вучняў студый выяўленчага мастацтва.



Павільён СССР на Міжнароднай выстаўцы ў Нью-Ёрку. Злева направа: 1) «Футбалісты»—скульптура работы **І. М. Чайкова** (бронза). 2) «Беларуская ССР»—горэльеф работы **М. Балашова.** 3) «Рабочы з рубінавай звяздой»—скульптура **Андрэева,** устаноўленая на пілоне павільёна.

Фотахроніка ТАСС.



«Граніца на замку». Скульптура **Орлова** для Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі ў Маскве.

Фота І. Каплінскага.

ЗБОРНІК ВЕРШАЎ І ПАЭМ АБ ВЯЛІКІМ СТАЛІНЕ

Паэтычная секцыя Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР прыступіла да складання зборніка вершаў і паэм, прысвечаных вялікаму правадыру народаў таварышу Сталіну. Створана рэдакцыйная калегія ў складзе народнага паэта БССР ордэнаносца Янкі Купалы, Г. Камянецкага і Эдзі Агняцвет. Зборнік будзе здадзен у друк у канцы мая бягучага года.

НОВЫЯ ПЕСНІ

Кампазітары Цікоцкі, Іваноў, Паленскі напісалі да першамайскіх дзён рад новых песень. Тав. Цікоцкі напісаў дзве песні: «Маладзёжная»—на тэкст паэмы «Радзіме і правадыру» і «Сустрэчная»—на словы беларускага паэта А. Русака. Тав. Іваноў напісаў «Першамайскую піонерскую» на словы М. Калачынскага.

Курсы кіраўнікоў драмгурткоў

25 красавіка ў Доме народнай творчасці БССР пачаліся заняткі на 3-месячных курсах кіраўнікоў драмгурткоў калгасаў, соўгасаў і МТС. На курсах займаюцца 18 чал., у тым ліку 4 жанчыны. Пераважная большасць курсантаў — радавыя калгаснікі, кіраўнікі і ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці. На курсах выкладаюць заслужаны артыст рэспублікі С. С. Бірыла, рэжысёр К. Н. Саннікаў, артыст Радыёкамітэта Скальскі, тав. Юдэлевіч і іншыя.

Апрача спецыяльных дысцыплін (асновы рэжысуры, выхаванне актора, тэхніка і логіка мовы, грым, тэхніка афармлення сцэны), курсанты вывучаюць матэрыялы XVIII з'езда ВКП(б) і пройдуць курс палітграматы.

У ДЗЯРЖАЎНЫМ ВЫДАВЕЦТВЕ БССР

СЕКТАР ДЗІЦЯЧАЙ ЛІТАРАТУРЫ

ВЫЙШЛІ З ДРУКУ: Я. Колас. «Раквусач» і «Выбраныя творы для дзяцей». **А. Стаховіч.** «Маленькія героі», апавяданне. **А. Ушакоў і А. Жаўрук.** «Пра майго таварыша», паэма. **В. Глазырын.** «У маленстве», аповесць на рускай мове. **М. Цэлеш.** «Знаходка» і «Курылка»—апавяданні. **М. Калачынскі.** «Косцячэкіст», паэма. **П. Левановіч.** «Дружба», апавяданні. **Р. Брохес.** «Гэльба», апавяданне. **У. Фінкель.** «Шолам-Алэйхем», біяграфічны нарыс. **О. Селіванава.** «Казкі».

ХРОНІКА

Тэатры і канцэртныя арганізацыі дадуць у першамайскія дні гарнізону Менска ў парадку шэфства над Чырвонай Арміяй 4 спектаклі і 30 канцэртаў. Тры канцэртныя брыгады выедуць у пагранзаставы.

У бліжэйшыя дні пры Доме Чырвонай Арміі імя Варашылава адкрываюцца месячныя курсы па падрыхтоўцы кіраўнікоў хораў часцей БАВА. Выкладаць на курсах у парадку шэфства над Чырвонай Арміяй будуць дацэнты і асістэнты Кансерваторыі БССР — Карповіч, Грынблат, Мацісон, Бары, Шварц, Смольскі і інш.

3 мая ў Менскай музычнай школе пачнуцца экзамены. Найбольш здольныя дзеці будуць пасланы ў арганізуемую з новага навучальнага года музычную школу-дзесяцігодку. Частка выдатнікаў - выпускнікоў школы будзе перададзена непасрэдна ў Кансерваторыю.

Народная артыстка рэспублікі Л. П. Александроўская днямі выступіла з творчым канцэртам на вечары работнікаў беларускай канторы Дзяржбанка. Расказаўшы аб сваёй творчай рабоце, якая пачалася ў гуртку чырвонаармейскай самадзейнасці, тав. Александроўская выканала рад твораў рускіх і замежных класікаў і совецкіх кампазітараў.

Музычны габінет Дома народнай творчасці БССР праводзіць цыкл лекцый па гісторыі музыкі. Лекцыі ў суправаджэнні музычных ілюстрацый чытае дацэнт Беларускай Дзяржаўнай кансерваторыі Б. С. Смольскі. На першай лекцыі — аб музычнай культуры эпохі феадалізма і італьянскага адраджэння — прысутнічала 25 удзельнікаў самадзейнасці. Другая лекцыя — аб буйнейшых кампазітарах першай паловы XVIII стагоддзя — адбудзецца 9 мая.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Еф. САДОЎСКІ

НАРЫС

ПАТРЫЁТЫ

Неяк спытаўся ў чырвонаармейца Матвеева адзін з яго таварышоў:

— Аляксандр Васільевіч, а якая прафесія была ў вас да танка?

Матвееў задумаўся і адказаў:

— А вось адгадай, — такая, што ў царскай Расіі яе ніхто не ведаў.

І пайшлі байцы перабіраць:

— Вадзіцель метро, электрапоезда...

І яшчэ дваццаць прафесій перабралі. А потым, нарэшце, нехта здагадаўся:

— Ага, ведаю: трактарыст!

— То-та, паважаныя. Прафесія, будзь здароў. Вельмі мне зараз прыгадзілася.

Матвееў — бывалы трактарыст. У калгасе ён адным з першых навучыўся вадзіць трактар.

Наш Матвеев—ох речист,
Разудалый тракторист...
Статен, строен и плечист,
Сам он чист, трактор чист, —

склаў нехта вясёлую частушку, калі ён пасля сканчэння ў раённым цэнтры курсаў першы раз праехаўся па вёсцы на новенькім трактары.

Хлопец моцна і глыбока палюбіў тэхніку. У МТС ён хутка вызначыўся сваёй страснай любоўю да машыны. Бывала, працоўны дзень даўно скончан, усе разышліся, а Саша Матвееў усё яшчэ корпаецца ля машыны, прыдумляе, вынаходзіць. Машына яго нават знешнім выглядам адрознівалася ад іншых.

Хутка яго вылучылі брыгадзірам. А там надышоў і прызыўны год. Хто з нашых юнакоў-прызыўнікоў, пераступаўшых парог пакоя, дзе засядае райваенкаматаўская камісія. не перажываў такіх мінут, якія перажыў Саша Матвееў! Пасля звычайных пытанняў аб адукацыі, прафесіі, яму задалі самае задушэўнае і глыбокае пытанне.

— А дзе-б вы, таварыш Матвееў, хацелі служыць совецкаму народу, у якой часці? Падумалі вы над гэтым? Якое жаданне выкажаце вы?

— Ці падумаў? Падумаў і даўно вырашыў. Нездарма-ж так люблю трактар! Прасіў-бы, таварыш камісар, у танкісты прызначыць.

І просьбу здаволілі.

Брат Сашы — Павел Матвееў, які меў гадовую адтэрміноўку, — таксама трактарыст і брыгадзір, — прышоў у ваенкамат прасіць, каб з яго знялі ўсе ільготы і адправілі разам з Аляксандрам у адну часць.

— Дык гэта брат ваш толькі-што быў у мяне? — усміхаючыся спытаўся камісар.

— Брат, — адказаў Павел Матвееў.

— Тады вельмі добра, мы дагаворымся дзе трэба і вы паедзеце разам.

Павел вельмі ўзрадваўся. Задаволен быў і Аляксандр.

Радасна сустрэлі і ў калгасе, у сям'і Матвеевых, вестку аб тым, што Саша і Павел будуць служыць разам. Ім паведамілі, што «камандванне вырашыла стварыць экіпаж братоў Матвеевых — Паўла і Аляксандра, калгаснікаў сельгасарцелі «Шлях Ільіча».

Браты прыехалі ў часць. У парку, дзе ў парадку стаяцьззяючыя чыстатой танкі, на вучобе ў класе, на палігоне, на выездзе яны заўсёды неразлучны. Іх так прывыклі бачыць разам, што калі дзе-небудзь паяўляецца Аляксандр, ведаюць, што там зараз будзе і Павел. Аляксандра і Паўла прызначылі ў адзін экіпаж, замацаваўшы за імі танк. Гэта яшчэ больш з'яднала братоў. Абодва трактарысты, яны мелі нядрэннае ўяўленне аб тэхніцы. У той час, як іншыя праходзілі яшчэ ля макетаў правілы танкаваджэння, яны, заняўшы свае баявыя месцы, зачыніўшы люк і прывёўшы ў дзеянне рычагі, упэўнена вялі машыну, выклікаючы гэтым захапленне ў камандзіраў і байцоў.

Вучэбная пляцоўка ўжо стала малой для маладых вадзіцеляў. Паступова яны выязджалі далей і ездзілі шпарчэй. Раней набытыя веды, вялікае стараннe, ненасытная любоў да тэхнікі рабілі сваю справу — Аляксандр і Павел у выпадку неабходнасці маглі замяніць адзін другога ля штурвала, абодва яны выдатныя стралкі, дасканала валодаюць зброяй і з ходу ці з кароткіх астановак паказваюць такія ўзоры стральбы, што можна падумаць: на гэтай машыне едуць бывалыя танкісты. Нават калі ідзе строй танкаў, падобных адзін на другі, як два таварныя вагоны, можна пачуць: «Гэта матвееўскі танк». Браніраванае тулава танка блішчыць: ні плямкі, ні слядоў; роўнамерна стукае матор; грозна выглядаюць баявыя жорлы. Няхай толькі загадаюць, і Матвеевым не трэба больш трох мінут, каб выступіць у самую далёкую дарогу.

У братоў здаровыя соцыялістычныя адносіны да сваіх абавязкаў, высокая свядомасць. Кожны імкнецца не адстаць ад другога. Павел прачытае «Гісторыю танкаў» — Аляксандр не адстане і прачытае следам за ім. Аляксандр дастане ў бібліятэцы папулярны дапаможнік «Баявое прымяненне танка»—кніга не вернецца ў бібліятэку, пакуль яе не прачытае і Павел. Разам і на лекцыі ходзяць у клуб, а калі аднаму не ўдасца пайсці з прычыны дзяжурства, прысутнічаўшы перакажа яму змест, растлумачыць, і зноў яны ні ў чым не адстаюць.

Яшчэ ў калгасе «Шлях Ільіча» браты Матвеевы славіліся як весельчакі, зацейнікі, танцоры і запявалы. У арміі гэта іх мастацтва яшчэ больш удасканалілася. Нават у плясцы не адстаюць адзін ад другога.

Аднойчы Матвеевы даведаліся, што разам з новым папаўненнем у часць прыбылі два браты Макаравы — Пётр і Васіль, — тамбоўцы, калгаснікі, добрыя хлопцы. Потым Матвеевы даведаліся, што і ў біяграфіях новых байцоў ёсць шмат падобнага з імі. Пётр Макараў чатыры годы працаваў трактарыстам, а апошні год перад адыходам у армію быў брыгадзірам. Вельмі цікавіцца машынай таксама і брат Васіль, хоць яму прышлося крыху цяжэй — да прыходу ў армію ён працаваў грузчыкам. Але Пётр дапамог яму, узяў асабістае шэфства над братам і навучыў усяму таму, што ведаў сам.

Мінуў некаторы час і Макаравы ўпершыню выехалі на машыне, — Васіль вадзіцелем, Пётр — камандзірам.

Строгі камандзір Пётр, патрабавальны, настойлівы. Прыглядзеўся ён, як працуюць Матвеевы, — спадабалася яму. Спадабалася дружба, узгодненасць, старанасць.

—Вася, — звярнуўся аднойчы ён да брата. — Думаю я тут аб адной справе, хачу з табой параіцца.

Васіль насцеражыўся. Брат-камандзір прапаноўваў пераняць матвееўскія метады догляду за танкам і выклікаць экіпаж Матвеевых на соцыялістычнае спаборніцтва.

Васіль зараз-жа згадзіўся. Камандзір і палітрук падраздзялення горача падтрымалі Пятра і Васіля. На бліжэйшым сходзе Пётр Макараў ад свайго імя і ад імя брата выступіў з прапановай—шырэй разгарнуць спаборніцтва паміж танкістамі. Асабіста ён з братам звяртаўся з выклікам да братоў Матвеевых. Танкісты горача сустрэлі прапанову Пятра, а Аляксандр Матвееў выступіў з адказным словам. Ён заявіў, што ад усяго сэрца падтрымлівае Макаравых і дзякуе за ўвагу. Хто каго пераможа ў спаборніцтве — пакажа справа. А, можа, экіпажы братоў і нароўні пойдуць.

Як прапанова Пятра Макарава, так і слова Аляксандра Матвеева спадабаліся байцам. Згуртаванасць братоў, іх гатоўнасць дапамагчы адзін другому, гарэнне на працы былі да спадобы ўсім байцам, якіх еднае агульная справа.

З газет аднавяскоўцы-калгаснікі даведаліся, што паміж братамі, якія складаюць два баявых экіпажы, заключана спаборніцтва, што Макаравы, Аляксандр і Павел, былі пасланы разам з іншымі байцамі і камандзірамі вітаць XVIII з'езд большэвіцкай партыі. Пішуць калгаснікі сваім землякам, што яны лічаць за гордасць адзначыць кожны баявы поспех Макаравых і Матвеевых, вельмі радуюцца іх дружбе і жадаюць ім новых перамог.

А поспехі ў братоў з часу абвяшчэння спаборніцтва яшчэ большыя. Адзін выпадак паказаў, на што здольны патрыёты. Выехалі экіпажы на вучэнне. На поўным ходзе імчацца танкі. Матвееў, як заўсёды, наперадзе. Сігналам камандванне дало Аляксандру і Паўлу заданне: ісці ў разведку. Звярнулі з дарогі. Перапаўзаючы праз балоты і равы, вялі Аляксандр і Павел сваю машыну. У адным месцы рэчка перагарадзіла ім дарогу. Мосцік на рэчцы стары, ледзь трымаецца. Выйшлі, агледзелі. Вытрымае, ці не вытрымае—невядома, а ехаць трэба. Павялі машыну, і мост абваліўся. Не разгубіўся экіпаж. Рывок наперад і, нават не замачыўшы танка, перамаглі перашкоду. У газетах пісалі аб доблесці Матвеевых.

У 1938 годзе Аляксандр закончыў службу і паехаў дадому. Прабыў дома месяц, два. Нельга сказаць, каб дома было дрэнна. Добра ў калгасе: і праца падабаецца, і жывецца сытна, і весела. І ўсё-ж цягне назад, у армію. Не вытрымаў Аляксандр, падаў заяву, каб назаўсёды застацца ў арміі.

— Чуў я, што паэтамі нараджаюцца, а я, мусіць, танкістам нарадзіўся,—заявіў Аляксандр сваім таварышам.

***

У ленінскім пакоі на самым відным месцы—дошка ўчоту. Кожны раз пасля праверкі заносяцца на яе паказальнікі вучобы. Прозвішчы Макаравых і Матвеевых заўсёды побач і паказальнікі ў іх заўсёды выдатныя.

Плячо ў плячо, не адстаючы адзін ад другога, ідуць у баявым спаборніцтве браты-патрыёты Макаравы і Матвеевы—дастойныя сыны совецкага народа.

№ часць БАВА.

Менск, друкарня «Звязды». Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у дэкаду. Уп. Галоўлітбела № Р—1159.